WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 МАЯ 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 96
(26960)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Беларусь зможа пераадолець крызісныя з'явы ў эканоміцы

Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў на сустрэчы з прафесарска-выкладчыцкім складам і студэнтамі Еўразійскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Л.М. Гумілёва.

«Апошнім часам нам крычаць: вось, у вас там праблемы. Нас жа накрыла другая хваля крызісу. Зноў падаражэлі рэсурсы фактычна ў два разы, якіх у нас няма. І ў нас адразу ад рэальнага сектара не атрымаеш таго аб'ёму валюты, на колькі вырас сыравінны рынак. Вельмі складана і цяжка знайсці адразу вялікую колькасць валюты, каб расплаціцца за ўсё гэта», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Так, у нас павялічыўся экспарт, але столькі валюты мы знайсці не можам. Таму зноў узніклі складанасці. І пытанне ў тым, як выкруціцца з гэтай сітуацыі. Выкруцімся. Калі ёсць жаданне, выйдзем з гэтай сітуацыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама пракаментаваў тэлевізійныя сюжэты, якія былі паказаны ў выпусках навін расійскіх тэлеканалаў у апошнія дні аб эканамічнай сітуацыі ў Беларусі. «Лукашэнка прадасць прадпрыемствы, ім трэба столькі, ім трэба гэта, — ствараюць ажыятаж вакол нашай краіны. Зразумела, жадаюць, напэўна, пажывіцца самі перш за ўсё. У такой сітуацыі мы самі выйдзем з гэтага становішча. Але мы проста так нікому нічога кідаць не будзем», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Што датычыцца сітуацыі на валютным рынку, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Мы спынілі прадаваць валюту з золатавалютных рэзерваў, а той курс, які ўстановіцца, той і будзе. Мы яго ўчора вызначылі на ўзроўні Br5 тыс. за $1. Няхай адбылася дэвальвацыя нацыянальнай валюты, нічога. Трэба, галоўнае, распарадзіцца гэтым, як трэба, — для экспартаарыентаванай эканомікі гэта вельмі важна».

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ён не супраць прыватнай уласнасці, але прыватызацыя не павінна быць абвальнай. «Усе хочуць танней купіць, а лепш — за бясцэнак. Мы і цяпер не супраць прыватнай уласнасці і падтрымліваем яе, але менавіта тых, хто стварае яе сам. Тая прыватная ўласнасць, якая заснавана на прыватызацыі і дасталася часам за бясцэнак, яна не цэніцца, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Спяшацца знішчаць дзяржпрадпрыемствы ні ў якім выпадку нельга, тым больш калі яны рэнтабельна працуюць».

«Нас не трэба кроіць па чужых лекалах. Еўрапейцы і амерыканцы павінны знайсці ў сабе сілы адмовіцца ад памылковых стэрэатыпаў і ўстарэлых падыходаў. Даўно пара пачаць выбудоўваць канструктыўнае ўзаемадзеянне ў інтарэсах нашых народаў. І мы заўсёды былі да гэтага гатовы і цяпер гатовы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што таксама перакананы ў важнасці адносін з ЗША як вядучай дзяржавай свету.

У прыватнасці, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, Беларусь для ЕС з'яўляецца ключавым партнёрам у плане забеспячэння транзіту грузаў, тавараў, пасажыраў з Захаду на Усход і ў зваротным напрамку. Еўрасаюз таксама з'яўляецца важным гандлёва-эканамічным партнёрам Беларусі наряўне з Расіяй. «Таму мы вельмі актыўна імкнёмся наладжваць з імі нармальныя адносіны, але нам пастаянна палкі ў колы ставяць і выстаўляюць палітычныя ўмовы — «дэмакратызацыя»: улада павінна быць парэзана на кавалкі і раздадзена розным групам па інтарэсах».

«Мы не можам пасекчы цяперашнюю сістэму нашага канстытуцыйнага ладу на кавалкі і размеркаваць яе паміж групамі па інтарэсах, палітычнымі партыямі і гэтак далей», — падкрэсліў беларускі лідар, адзначыўшы, што сацыялагічныя апытанні, нават так званыя незалежныя, сведчаць аб тым, што прыхільнікаў палітычных партый у Беларусі ўсяго амаль 1,5 працэнта, што часам не перавышае статыстычнай хібнасці.

«Ну, дык чаму мы павінны ісці тым шляхам, які нам навязваюць?» — задаў пытанне Прэзідэнт Беларусі.

«Націск ідзе з усіх бакоў, раптам задэмакратызавалася кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, пачаўся націск. Амаль што заявы чую Лаўрова аб захаванні ці то правоў чалавека, ці то дэмакратыі. Сяджу і думаю: хто б казаў», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

«НА ВЫПАС!»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Патаронаўка, Клімавіцкі раён.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПАМЁР ЯШЧЭ АДЗІН ПАЦЯРПЕЛЫ АД ВЫБУХУ Ў МЕТРО

Учора тэракт у мінскім метро нагадаў пра сябе зноў: памёр яшчэ адзін пацярпелы. Гэта ўрач Андрэй Ільін. Ён стаў 15-й ахвярай выбуху ў метрапалітэне, які адбыўся 11 красавіка.

37-гадовы Андрэй Ільін працаваў урачом у бальніцы хуткай дапамогі, у студэнцкія гады быў фельчарам хуткай дапамогі. Падчас выбуху на станцыі «Кастрычніцкая» Андрэй выходзіў з таго самага цягніка. У мужчыны быў дрэнны зрок, і ён насіў акуляры. Пасля выбуху ён цалкам перастаў бачыць, але спадзяваўся на тое, што вочы ўдасца выратаваць і зрок адновіцца. Рабіць яму аперацыю прыязджаў з Санкт-Пецярбурга галоўны афтальмолаг Міністэрства абароны Расіі Эрнест Бойка. Некалькі аперацый Андрэю Ільіну было зроблена на нагах. З 10-й клінічнай бальніцы ён быў пераведзены ў рэабілітацыйны цэнтр у Аксакаўшчыне. Паводле сведчання яго калег, у Андрэя адарваўся тромб.

У Андрэя Ільіна засталася жонка Наталля, сямігадовы сын Дзіма і 5-месячная дачка Ганначка.

Як паведамляе Міністэрства аховы здароўя, зараз у стацыянарах застаецца 20 пацярпелых падчас выбуху. Стан чатырох з іх, якія знаходзяцца ў бальніцы хуткай дапамогі, урачы ацэньваюць як сярэдняй ступені цяжкасці, у астатніх — лёгкай ступені.

Алена КРАВЕЦ.

МЯНЯЮЦЦА ТАРЫФЫ НА МІЖНАРОДНЫЯ РЭЙСЫ

З 26 мая мяняюцца тарыфы на праезд на рэгулярных рэйсах па міжнародных маршрутах.

Датычыцца гэта праезду ў аўтобусах дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс». Змены закрануць рэгулярныя рэйсы па маршрутах: Мінск — Варшава (17.40), Мінск — Вільнюс (1.30, 8.20, 11.00), Мінск — Друскінінкай (23.55), Мінск — Калінінград (5.40), Мінск — Каўнас (7.20), Мінск — Кіеў (22.45), Мінск — Масква (18.10), Мінск — Рыга (10.00), Мінск — Рыга праз Даўгаўпілс (21.30), Мінск — Рыга праз Вільнюс (23.30), Мінск — Санкт-Пецярбург (17.00), Мінск — Талін (15.30).

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАРЫСТАЮЧЫСЯ НЯЎВАЖЛІВАСЦЮ АХВЯР, МІНЧАНІН ЗДЗЯЙСНЯЎ КРАДЗЯЖЫ НА ВЫСТАВАХ І Ў КРАМАХ

22-гадовы мінчанін здзяйсняў крадзяжы на выставах і ў крамах, а калі яго затрымалі, прызнаўся, што яго ахвярам трэба было б быць больш уважлівымі.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, затрыманы ўпершыню пайшоў на правапарушэнне, калі быў наведнікам тэхнічнай выставы. Ён звярнуў увагу на няўважлівасць асобных удзельнікаў экспазіцыі і вырашыў паспрабаваць. Разыгрываючы зацікаўленасць, малады чалавек знаходзіў момант і забіраў усё, што дрэнна ляжала на экспазіцыйных стэндах: мабільныя тэлефоны, лічбавыя фотаапараты і інш. Пасля ўдалага наведвання выставы малады чалавек пачаў мэтанакіравана шукаць магчымасці для здзяйснення крадзяжу. Пераважна ён ажыццяўляў іх у крамах, спецыялізуючыся на адзенні і прадуктах харчавання. Пакуль дакладна вядома пра шэсць злачынных эпізодаў, да якіх непасрэднае дачыненне мае затрыманы. Аднак у міліцыі мяркуюць, што іх было больш.

Цэнтральным РАУС сталіцы заведзена крымінальная справа. Затрыманы свае паводзіны тлумачыць барацьбой з дэпрэсіяй, якая здарылася ў яго пасля пазбаўлення правоў кіроўцы. А наконт сваіх ахвяр ён заўважыў, што ім трэба было больш уважліва ставіцца да захавання даверанай ім маёмасці.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Velcom павысіць на 10 % цэны на паслугі сувязі

з 24 чэрвеня 2011 года. Аб гэтым **БЕЛТА** паведамілі ў ЗП «Вэлком».

Тарыфы на асноўныя паслугі будуць акруглены да аднаго рубля згодна з правіламі арыфметычнага акруглення, тарыфы на разавыя паслугі — да 10 рублёў. Без змяненняў застаецца абаненцкая плата пакетаў паслуг мабільнага інтэрнэту. Кошт SMS-паведамлення складзе 150 рублёў. Памеры штомесячных плацяжоў па растэрміноўцы за абсталяванне па раней заключаных дагаворах застаюцца нязменнымі.

«Прамая лінія»

ПЕНСІЙНЫЯ НЮАНСЫ ПЛЮС АДРАСНЫЯ ВЫПЛАТЫ

Пенсіі і адрасная сацыяльная дапамога. Няма сумненняў, што дзве гэтыя тэмы з'яўляюцца актуальнымі для многіх. Таму менавіта ім і будзе прысвечана чарговая «прамая лінія» нашай газеты з удзелам **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ**.

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» будзе праходзіць **31 мая з 12 да 13 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах **(8 017) 292 38 92 і 292 38 21. Нумар для папярэдніх пытанняў — (8 017) 287 17 57.**

САМЫ ВЯЛІКІ ДАХОД ЖЫХАР МІНСКА АТРЫМАЎ ЛЕТАСЬ АД ПРОДАЖУ АКЦЫЙ

ДНЯМІ былі падведзены вынікі дэкларавання фізічнымі асобамі даходаў за 2010 год. Як паведаміла ўчора ў Нацыянальным прэс-цэнтры намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізасоб МПЗ Святлана ШАЎЧЭНКА, усяго ў кампаніі дэкларавання даходаў за мінулы год сёлета прымалі ўдзел больш за 24 тысячы чалавек.

Пасля кампаніі менавіта гэтыя людзі павінны будуць заплаціць у бюджэт каля 25 млрд рублёў дадатковых падатковых адлічэнняў. У параўнанні з мінулым годам сёлета колькасць дэкларантаў у падатковых інспекцыях паменшылася адразу на 14 тысяч чалавек. Гэта тлумачыцца тым, што ў Беларусі была ўведзена адзіная стаўка падаходнага падатку ў памеры 12 працэнтаў. Пасля ўвядзення плоскай шкалы падаходнага падатку ў работнікаў з некалькімі цывілізаванымі крыніцамі даходаў адпала неабходнасць займацца дэклараваннем сукупнага гадавога даходу.

Хто павінен быў наведваць падатковыя інспекцыі сёлета? Па-першае, гэта тыя, хто атрымліваў даходы ад іншых фізічных асоб. Напрыклад, гэта даходы, атрыманыя ад продажу другой кватэры, дома, дачы, зямельнага ўчастка за апошнія 5 гадоў, а таксама ад продажу другой машыны на працягу года. Абавязкова трэба было падаваць дэкларацыю аб даходах, калі апошнія атрыманы за мяжой ці з-за мяжы.

Так жа дэкларацыі аб даходах падавалі ў інспекцыі тыя асобы, якія мелі права на падатковыя вылікі. Святлана Аляксандраўна адзначыла, што сёлета дэкларацыі ў інспекцыі прынеслі 837 чалавек, якія вырашылі напрамую ў падатковым органе скарыстацца сваім правам на атрыманне падатковай ільготы. Пасля правядзення пераразлі падаткаў гэтым людзям будзе вернута каля 1 млрд 400 мільёнаў рублёў пераплачаных падаткаў. Галоўным чынам, гэта сацыяльныя ільготы, калі дзеці ў падаткаплацельшчыка з'яўляюцца студэнтамі на платнай аснове ва ўстановах адукацыі нашай краіны, а таксама маёмасныя вылікі, якія даюцца людзям з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, якія будуюць жыллё за ўласныя ці крэдытныя грошы.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Святлана Шаўчэнка паведаміла, што змяненне стаўкі падаходнага падатку ў 2012 годзе ў нашай краіне не плануецца. Больш за тое, увядзенне адзінай плоскай шкалы падаходнага падатку ў памеры 12 працэнтаў прывяло да павелічэння агульных аб'ёмаў накіраванага падаходнага падатку ў бюджэт. Калі раней доля гэтага падатку ў бюджэце краіны складала 11 працэнтаў, то па выніках мінулага года яна павялічылася да 16 працэнтаў. За мінулы год істотна павялічылася доля падаходнага падатку, які плацілі менавіта камерцыйныя структуры.

Святлана Аляксандраўна агучыла пералік падатковых ільгот, якія пачалі дзейнічаць пры падаткаабкладанні фізічных асоб сёлета.

Раней, калі чалавек нешта вырошчваў на ўласным падсобным участку і атрымліваў даход ад гэтай дзейнасці ў памеры больш чым на 17,5 млн рублёў, тады з гэтых лішніх даходаў неабходна было плаціць падаходны падатак. Сёлета ўсе даходы ад продажу ўласнай прадукцыі, атрыманай на прысядзібнай гаспадарцы, падаткамі не абкладаюцца. Існуюць такія асобы, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, аднак атрымліваюць пенсію ў адпаведнасці з заканадаўствам замежных дзяржаў — напрыклад, Расіі. Летась такі даход з-за мяжы абавязкова дэкларавацца і падлягаў падаткаабкладанню нашай краінай. Цяпер і з такіх пенсій падатак плаціць ужо не трэба.

Новая льгота датычыцца і рынку каштоўных папер. Так здарылася, што грамадзяне, якія набывалі каштоўныя паперы (акцыі) 16—17 гадоў таму, сёння не маюць адпаведных дакументаў, якія сведчаць аб тым, за якую суму грошай яны былі набыты. Калі сёння прадаваць гэтыя акцыі, то неабходна плаціць падатак з атрыманага даходу, які з'яўляецца розніцай паміж сумай продажу і куплі каштоўных папер. У гэтай сітуацыі ўладальнікі такіх актываў плацілі падаткі з усёй сумы продажу акцый. Сёлета гэтыя людзі могуць атрымаць падатковы вылік у памеры 10 працэнтаў ад агульнай сумы продажу каштоўных папер. Падобная падатковая льгота пачынае сёлета дзейнічаць і ў тым выпадку, калі фізічная асоба на працягу года прадае другі аўтамабіль і не мае адпаведных дакументаў аб кошце набытай машыны. І ў гэтым выпадку падатковы вылік складае 10 працэнтаў ад агульнай сумы продажу аўто.

Сёлета пачынае дзейнічаць даволі цікавая льгота па даходах, атрыманых за працу па найме па дагаворах з міжнароднымі арганізацыямі. Гаворка ідзе пра даходы, атрыманыя з-за мяжы. Цяпер такія даходы цалкам вызваляюцца ад падаткаабкладання на працягу 5 гадоў. Разам з тым, ільгота будзе дзейнічаць пасля выканання пэўных умоў. Гэты заробак неабходна атрымаць у грашовай форме, ён будзе залічаны на рахункі ў беларускіх банках, а ў работніка павінен быць дакумент сур'ёзнай установы замежнай дзяржавы аб тым, што гэты даход атрыманы за пэўную работу ці паслугу.

Карэспандэнту «Звязды» было цікава даведацца аб тым, хто з беларусаў заплаціў самы вялікі падатак па выніках дэкларавання за мінулы год. Спадарыня Шаўчэнка паведаміла, што гэта жыхар горада Мінска, які летась даволі ўдала прадаў салідны пакет акцый адной камерцыйнай установы.

Сяргей КУРКАЧ.

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» сообщает, что с 26 мая 2011 года устанавливаются процентные ставки в следующем размере:

1. по заключенным до 12.05.2011 договорам срочного банковского депозита в белорусских рублях «Актуальный»:

Срок привлечения	Размер процентов (годовых)
6 месяцев	20,5

2. по заключенным до 12.05.2011 договорам срочного банковского депозита в иностранной валюте «Баланс интересов»:

Срок привлечения	Размер процентов (годовых), доллары США, евро		
	за 1-й месяц	за 2-й – 10-й месяцы	за 11-й – 12-й месяцы
1 год	8	9	10

3. по заключенным и автоматически продленным до 12.05.2011 договорам карт-счета в иностранной валюте «Универсальный»:

Срок привлечения	Размер процентов (годовых), доллары США, евро
1 год	9

4. по заключенным и переоформленным до 12.05.2011 договорам срочного банковского депозита в иностранной валюте «Динамичный»:

Срок привлечения	Размер процентов (годовых)	
	доллары США, евро	российские рубли
3 года	9,1	10

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:
- **148** (в стационарной сети);
- МТС **(029) 5-148-148, 2-148-148**;
- Velcom **(044) 77-00-148, 77-55-148**.

Проценты, выплаченные по депозитам в течение 2010 г. (млрд. руб.): январь – 12,4; февраль – 12,7; март – 15,5; апрель – 14,0; май – 14,6; июнь – 14,7; июль – 15,4; август – 16,9; сентябрь – 16,3; октябрь – 15,6; ноябрь – 17,1; декабрь – 16,8.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

Хозяйственный суд города Минска

объявляет о проведении повторных публичных торгов по продаже имущества,

принадлежащего ПК ООО «БИКАРАН»

Контейнерная АЗС, инвентарный номер 644/С-3386, строительный объем здания 63,0 куб. м, стоимостью 409 847 040 рублей, расположенная по адресу: Минская обл., Солигорский район, г.п. Старобин.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага — 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества, что составляет 20 492 352 рубля.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,

а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 13.06.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

ЗА ДОПОЛНИТЕЛЬНОЙ ИНФОРМАЦИЕЙ ОБРАЩАТЬСЯ:

судебный исполнитель Рогацевич Т.Т., тел./факс: 294 93 89
ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк», Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ОБЪЯВЛЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ХОЗЯЙСТВЕННЫМ СУДОМ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО КУП ОБУ «Витрайбыт»
(г. Витебск, ул. Ленинградская, 4; УНП 300064006), методом повышения начальной цены.

НА ТОРГИ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ СЛЕДУЮЩЕЕ ИМУЩЕСТВО:

№ лота	Название и описание предметов	Количество, мера, вес	Оценка, с НДС, бел. руб.
1	Комплексно-приемный пункт «Летцы», инв. № 200/С-48798 общей площадью 186,9 кв.м, год постройки – 1968, стены – кирпичные, перегородки – кирпичные, перекрытия и фундамент – железобетонные, расположенный по адресу: Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Малые Летцы. Наличие инженерных коммуникаций.	1 шт.	107 421 600

Время проведения торгов – 14.06.2011 года, в 14.10 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 324.

В соответствии с Хозяйственным процессуальным кодексом Республики Беларусь лицу, желающему принять участие в торгах, до начала их проведения необходимо подать заявку в хозяйственный суд Витебской области, оформить подписку об отсутствии препятствий, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, для приобретения имущества, а также внести задаток до момента начала проведения торгов на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области.

Заявки принимаются в хозяйственном суде Витебской области в рабочие дни с 9.00 до 18.00.

Сумма задатка в размере 10% от первоначальной стоимости имущества (лота) перечисляется на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «СБ «Беларусбанк» г. Витебск, код 259, УНП 300007670.

Минимальная величина первого шага составляет 5% стоимости реализуемого с торгов имущества (лота).

Сумма задатка, внесенная лицом, купившим с торгов имущество, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов внесенные ими суммы по их заявлению возвращаются в течение пяти рабочих дней после окончания торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 5 мая 2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в отдел исполнения постановлений хозяйственного суда Витебской области по телефонам: тел./факс 8 (0212) 49 13 46, +375 (44) 744 63 00 (судебный исполнитель Лесковец Денис Анатольевич), 8 (0212) 49 13 42, +375 (29) 150 24 10 (судебный исполнитель Халков Дмитрий Вячеславович), а также (80212) 49 13 40 (старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович), и на сайт хозяйственного суда Витебской области www.court.by, e-mail: vitebsk@court.by.

ЯШЧЭ ПРА ЭКАНОМІКУ І ПРАФЕСІЮ

РОСТ ЗАРПЛАТЫ АПЯРЭДЗІЛА ІНФЛЯЦЫЯ

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, сярэдняя налічаная зарплата па Беларусі ў красавіку склала 1 млн. 563,4 тыс. рублёў — гэта на 1,7 працэнта ці на 26,2 тыс. рублёў больш, чым у сакавіку. Разам з тым, даводзіцца канстатаваць як факт: рэальная, з улікам інфляцыі, сярэдняя красавіцкая зарплата ў параўнанні з тым жа сакавіком зменшылася на 2,7 працэнта.

Як адзначылі ў Белстаце, найбольшы памер налічанай сярэдняй зарплаты ў красавіку адзначаны ў Мінску — 2 млн. 29,6 тыс. рублёў. Сярэдні паказчык аплаты працы за мінулы месяц па Мінскай вобласці склаў 1 млн. 540,3 тыс., Гомельскай — 1 млн. 462,9 тыс., Гродзенскай — 1 млн. 430,9 тыс., Магілёўскай — 1 млн. 416,6 тыс., Віцебскай — 1 млн. 406 тыс., Брэсцкай — 1 млн. 395,6 тыс. рублёў.

Што ж да асобных галін, то ў красавіку агульны ўзровень аплаты працы па прамысловасці склаў 1 млн. 680,8 тыс. (ад 2 млн. 672,8 тыс. па хімічнай вытворчасці да 1 млн. 112 тыс. па тэкстыльнай і швейнай вытворчасці), па будаўніцтве — 1 млн. 900,9 тыс., на транспарце і ў сувязі — 1 млн. 707 тыс., у сельскай, паляўнічай і лясной гаспадарцы — 1 млн. 114,5 тыс. (у тым ліку 1 млн. 483,6 тыс. у настаўніках і 2 млн. 200,1 тыс. у прадстаўніках прафесарска-выкладчыцкага складу), у сферы аховы здароўя і аказання сацыяльных паслуг — 1 млн. 286,4 тыс. (у тым ліку ўрачоў — 2 млн. 261,6 тыс., а ў сярэдняга медперсаналу — 1 млн. 252,8 тыс.), у сферы фінансавага пасрэдніцтва — 2 млн. 734,6 тыс., у сферы страхавання — 2 млн. 31 тыс. рублёў.

Сяргей ГРЫБ.

БЕЗ НОВЫХ «ПРЫВІЛЕЯЎ». І БЕЗ ЗМЯНЕННЯ ЎЗРОСТУ ВЫХАДУ НА ПЕНСІЮ

Канкрэтныя памеры павышэння працоўных пенсій будуць разлічаны ў самы блізкі час, пры гэтым таксама плануецца праіндэксаваць заробкі бюджэтнікаў, стыпендыі і дапамогі, паведаміла міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна.

З улікам паступовага старэння насельніцтва ў нашай краіне не плануецца ўвядзення новых пенсійных ільгот — у прыватнасці, даплат да пенсій маці, якія выхавалі трох і больш дзяцей. Разам з тым, як адзначыла Марыяна Шчоткіна, у бягучай пяцігодцы ў Беларусі не плануецца і змяненне пенсійнага ўзросту як для мужчын, так і для жанчын.

Апроч таго, як зазначыла міністр падчас «прамой лініі» з чытачамі «Народнай газеты», ужо падрыхтаваны прапановы па павелічэнні стыпендый беспрацоўным, якія накіраваны на прафесійнае навучанне ці перанавучанне. Пры гэтым у перспектыве ёсць намер атрымліваць больш поўную інфармацыю аб колькасці і структуры незанятага насельніцтва. У прыватнасці, з 2012 года ацэнка ўзроўню беспрацоўя ў Беларусі будзе праводзіцца, зыходзячы не толькі з паказчыкаў рэгістрацыі ў службе занятасці, але і на падставе штоквартальных абследаванняў хатніх гаспадарак.

Сяргей ГРЫБ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УНУТРАНЫ ДЗЯРЖДОЎГ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ ВЫРАС ДА РЭКОРДНЫХ 60,1% ВУП

Назапашаны ўнутраны дзяржаўны доўг Вялікабрытаніі на канец красавіка склаў рэкордныя 910,1 млрд фунтаў стэрлінгаў, ці 60,1% ВУП. Як паведамляюць інфармагенцтвы, год таму гэты паказчык складаў 765,5 млрд фунтаў, ці 53% ВУП.

Пры гэтым, паводле звестак Бюро нацыянальнай статыстыкі, чысты аб'ём пазыковых сродкаў дзяржаўнага сектара ў Вялікабрытаніі без уліку фінансавых інтэрвенцый склаў у красавіку 10 млрд фунтаў. Аналітыкі прагназавалі, што гэты паказчык складзе 6,5 млрд фунтаў у справаздачным перыядзе.

Урад Вялікабрытаніі ў красавіку 2011 года ўжо выплаціў па доўгу працэнтаў на 4,6 млрд фунтаў.

БРОНЕЦЯГНІК КІМ ЧЭН ІРА ПРЫБЫЎ У ПЕКІН

Лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ір у сераду на спецыялізаваным бронецягніку прыехаў у сталіцу Кітая, паведамляе Associated Press са спасылкай на паўднёвакарэйскае агенцтва «Рэнхап».

Афіцыйна Кітай пакуль не каментуе ні сам факт візіту лідара Паўночнай Карэі, ні праграму яго знаходжання ў КНР. Паводле неафіцыйных звестак, у Пекіне Кім Чэн Ір сустрэнецца са старшынёй КНР Ху Цзіньтао. Галоўнай тэмай перамоў, як чакаецца, стане эканамічная сітуацыя ў КНДР. Паводле звестак паўднёвакарэйскіх СМІ, прэм'ер-міністр КНР Вэнь Цзябао 22 мая падчас сустрэчы з лідарам Паўднёвай Карэі Лі Мэн Бакам распавёў, што Кім Чэн Ір жадае «зразумець, як развіваецца кітайская эканоміка», і выкарыстаць гэтыя веды ў сваёй краіне.

У ЕГІПЦЕ МОГУЦЬ УВЕСЦІ ДРЭС-КОД ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

Ў Егіпце могуць увесці строгі жаночы дрэс-код, а значыць, замежным гасцям прыйдзецца забыцца пра шорты, штаны і кароткія рукавы. Такія навіны могуць напалохаць турыстаў мацней за акул-людаедаў і рэвалюцыю, піша «Труд».

Упершыню ініцыятыва рэгламентаваць знешні выгляд турыстаў з'явілася ў Егіпце як адказ на дзеянні ўлад Францыі, дзе летась была ўведзена забарона на нашэнне хіджаба. З таго часу падобныя настроі артадаксальных ісламістаў сярод егіпцян узмацніліся, а мінулая рэвалюцыя і звяржэнне Хосні Мубарака толькі павялічылі іх шанцы здабыць заканадаўчы статут, паведамляе газета. Цяпер за ўводзіны дрэс-кода для жанчын актыўна выступаюць жыхары папулярнага курортнага горада Хургады. Патрабаванні да знешняга выгляду турыстак зводзяцца да таго, што штаны ці шорты насіць нельга, спадніца павінна быць не карацей, чым да калена, а рукі цалкам закрытыя.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.05.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	4 932,00	1 чэшская крона	282,52	USD	28,4794
▲ 1 еўра	6 921,08	1 польскі злоты	1 756,72	10 UAH	35,6104
1 латвійскі лат	9 786,69	▲ 1 расійскі рубель	113,02	10000 BYR	57,7558
1 літоўскі літ	2 010,56	1 украінская грыўня	617,35	EUR	39,9566

Агенства Уладзімра Гуцалюка

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Беларусь зможа пераадолець крызісныя з'явы ў эканоміцы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларусь разлічвае, што ў АЭП будзе адзіная тарыфная палітыка і роўны доступ да транспартных сістэм. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што раней існавалі значныя цяжкасці пры пастаўцы беларускіх тавараў праз Расію ў Казахстан. Іх канчатковы кошт часам павялічваўся ў два разы ў параўнанні з першапачатковым. І гэта стала адной з асноўных прычын, чаму Беларусь і Казахстан пайшлі на фарміраванне Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. «Калі не будуць вырашаны гэтыя пытанні роўнага доступу да магістраляў, нафтаправодаў, не будзе роўнай для ўсіх тарыфнай палітыкі, — няхай будзе высокая, але роўная, — тады і АЭП не патрэбна». «Для Казахстана — гэта акно ва ўвесь свет. Таму што на працягу двух-трох гадоў вы вырабіце ў два разы больш нафты, а куды падзець? Трубы ж ёсць праз Расію, але квоты Расія ўстанавіла — 2-3 млн.т прапампоўкі, не ведаю, колькі цяпер. А мы можам перапрацаваць 22 млн.т».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь хацела б, каб Расія і Казахстан канкурыравалі паміж сабой: «Хто лепшыя ўмовы прапануе — з тым і будзем супрацоўнічаць». «Мы пайшлі б на акцыяніраванне нашых прадпрыемстваў з Казахстанам, на прыватызацыю нашых нафтаперапрацоўчых і нафтахімічных комплексаў. У Казахстана вялікі да гэтага інтарэс. Але, зноў жа, інтарэсы нашага вялікага брата тут перасякаюцца, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І мы вырашылі ў АЭП гэтыя пытанні вырашыць, і мы рухаемся ў гэтым напрамку, спадзяёмся, што гэтыя пытанні будуць вырашаны».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў дзіўнасць таго факта, што Расія не хоча гандляваць з Беларуссю нафтай і газам за расійскія рублі. «Прыродны газ і нафта дорага каштуюць, і трэба іх аплачваць, і мы аплачваем, хоць нам і складана, але для гэтага трэба мець валюту. Дзіўна, але Расія хоча, каб мы з імі гандлявалі не за расійскія рублі, а за долары».

У апошні дзень візіту, 25 мая, Аляксандр Лукашэнка ўсклаў кветкі да манумента «Абаронцам Айчыны».

БЕЛТА.

МЗС Беларусі: прычыны аднабаковых санкцый ЗША на беларускія прадпрыемствы незразумелыя

Беларускаму боку незразумелыя прычыны распаўсюджвання аднабаковых санкцый на прадпрыемствы «БелОМА» і «Белтэхэкспарт». Аб гэтым заявіў прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Андрэй Савіных, каментуючы па просьбе карэспандэнта БЕЛТА рашэнне, прынятае Злучанымі Штатамі Амерыкі. Ён таксама дадаў: «У кантактах з амерыканскім бокам мы паспрабуем удакладніць гэтыя акалічнасці».

Дзяржузнагароды па выніках пяцігодкі

Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў дзяржаўнымі ўзнагародамі работнікаў, якія ўнеслі значны асабісты ўклад у выкананне прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі ў 2006-2010 гадах, паказалі высокія дасягненні ў вытворчай і сацыяльна-культурнай сферах. Указ аб гэтым Аляксандр Лукашэнка падпісаў 23 мая.

Ордэна Айчыны I ступені ўдастоены генеральны дырэктар ЗАТ «Агракамбінат «Зара» Леанід Маісееў. Ордэнам Айчыны II ступені ўзнагароджаны генеральны дырэктар ААТ «Будтрэст № 3 ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі» Мікалай Ашэйчык, наладчык аўтаматаў і паўаўтаматаў цэха гідратрансмісій ААТ «Беларускі аўтамабільны завод» Яўген Жук, генеральны дырэктар ААТ «Пеленг» Уладзімір Пакрышкін, генеральны дырэктар ААТ «Савушкін прадукт» Аляксандр Саўчык. Ордэна Айчыны III ступені ўдастоены дырэктар ААТ «БелКрэда» Аліна Бахар, старшыня СВК «Атраднае-агра» Любанскага раёна Віктар Біончык, дырэктар ААТ «МПМК-198» Мікалай Гіль, генеральны дырэктар РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» Аляксандр Ляхаў. Гэтай высокай узнагародай адзначаны таксама дырэктар ААТ «Агракамбінат «Усход» Віктар Пінчук, старшыня СВК імя Дзеншчыкова Васіль Свірыд, дырэктар ААТ «Саўгас-камбінат «Сож» Анатоль Татарынаў, дырэктар ААТ «Маяк Высокае» Рыгор Фалько.

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны дырэктар дзяржаўнага ўнітарнага прадпрыемства меліярацыйных сістэм «Мядзельскае ПМС» Анатоль Вайнілка, галоўны трэнер спартыўнага хакейнага клуба «Рытм Азот» ААТ «Гродна Азот» Ніна Дашко, трактарыст-машыніст КСУП «Астроўшчына» Мікалай Дземянчонак, аператар па адкорме буйной рагатай жывёлы СВК «Сянькоўшчына» Андрэй Крыўда, прарэктар па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Аляксандр Хмыль, генеральны дырэктар ААТ «Керамін» Анатоль Цюцюноў. Дырэктар сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 1 у Ашмянах Міхаіл Гружэўскі і прафесар кафедры выяўленчага мастацтва Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава Анатоль Кавалёў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Медалём «За працоўныя заслугі» адзначаны 52 работнікі розных сфер дзейнасці.

Акрамя таго, указам кіраўніка дзяржавы прысвоена ганаровае званне народнага артыста Беларусі вядучаму майстру сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Віктару Манаеву і артысту — вядучаму майстру сцэны Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Таццяне Мархель. Ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» прысвоена артысту — вядучаму майстру сцэны Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Ігару Сігаву. Загадчыку аддзела па пытаннях грамадзянства і памілавання Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандру Кісялёву прысвоена ганаровае званне заслужанага юрыста Беларусі. Намеснік галоўнага ўрача па хірургічнай рабоце (кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак) мінскай 9-й клінічнай бальніцы Алег Румо ўдастоены ганаровага звання «Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь».

Ганаровае званне заслужанага работніка прамысловасці прысвоена генеральнаму дырэктару РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі Раману Алейніку, генеральнаму дырэктару ААТ «Івацэвічдрэў» Барысу Міхнюку, генеральнаму дырэктару ААТ «Магілёўскі завод «Строммашына» Уладзіміру Саханько.

Дырэктару прыватнага ўнітарнага аграрнага прадпрыемства «Маладава-Агра» Сцяпану Халько прысвоена ганаровае званне заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЯБЛЫКІ РАЗБОРУ

Дэпутат Уладзімір КУЖАНАЎ эмацыянальна падзяліўся **з міністрам гандлю Валянцінам ЧАКАНАВЫМ** сваімі ўражаннямі ад цэн:

— Заходжу ў краму на Мяснікова, што знаходзіцца тут у нас непадалёк: стаіць бутэлька гарэлкі — 9 тыс, і кілаграм яблыкаў — 13 тысяч!

Міністр супакойваў адной сваёй інтанацыяй:

— Вы ведаеце, што адбываецца на ўнутраным рынку. Насамрэч існуюць перакосы: з-за няўстойлівасці валютнага рынку імпарцёры закладваюць свае рызыкі наконт долара, які яны купляюць на міжбанку, і натуральна, кошт павышаецца.

Валянцін Чаканаў запэўніў народных выбраннікаў, што падначаленае яму ведамства праверыла ўсе гандлёвыя прадпрыемствы і ніякіх парушэнняў цэнаўтварэння з боку гандлю не выявіла.

— Мы кантактуем з бізнэсам, каб забяспечыць усім неабходным таварам, — дадаў ён.

На абарону беларускіх яблыкаў, а заадно і бульбы, устаў таксама **дэпутат Аляксандр АНТОНЕНКА**.

— Мы вось завозім яблыкі і бульбу з Польшчы, Галандыі... Няўжо ў нас не хапае беларускіх яблыкаў і бульбы?

— Не ляжыць беларускі яблык так, як імпартны, — адказвае міністр, маючы на ўвазе кароткі тэрмін захоўвання айчыннай садавіны. — Пытанне да нашых навукоўцаў, аграрыяў. Нележастойкія беларускія яблыкі. Іх не хапае, магу сказаць з усёй адказнасцю. На мой погляд, трэба закладваць, напрыклад, не 15 тыс тон, а 25 — 30 тысяч.

Неабходнасць ствараць дадатковыя сады і сховішчы падкрэсліў таксама **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**. Ён дадаў, што пытанне на парадку дня, і выказаў упэўненасць у яго вырашэнні ў бліжкай будучыні.

— А вось бульбы дастаткова, шмат паставілі з-за мяжы, — адказвае на дэпутацкае пытанне міністр гандлю. — Тое, што яна завозіцца з Марока... Забарон няма. Хоць я паставіў бы пытанне: «А навошта?». Аднак калі бульба з Марока завозіцца і яе купляюць — значыць, яна некаму патрэбная. Гэта права спажыўцоў. У іх павінен быць выбар.

Тым часам у Міністэрства гандлю пазіцыя выключна патрыятычная:

— Мы дзвюма рукамі «за», каб айчыннага тавару было больш!

ЦЫГАРЭТЫ-НЕВІДЗІМКІ

Упакоўкі цыгарэт над касамі ў крамах падаюцца **дэпутату Уладзіміру ВАСІЛЁНКУ** схаванай рэкламай.

— Над касай вісяць гэтыя яркія ўпакоўкі, дзіця бачыць — рука так і цягнецца, — абураецца парламентарый.

Прапанова народнага выбранніка такая: скрыні з цыгарэтамі ад кас прыбраць і прадаваць іх па спісах — маўляў, няхай выбіраюць з пераліку.

Міністр гандлю да абурэння дэпутата паставіўся з разуменнем: «Так, гэта можа раздражняць людзей, якія не паляць». Аднак ён нагадаў, што заканадаўчай забароны на продаж тытунёвых вырабаў у крамах няма. Таму нейкіх забарончых захадаў з боку Міністэрства гандлю быць не можа. Толькі заканадаўчымі карэкціроўкамі. Скажам, гэта можа стаць часткай дыскусіі па законапраекце аб гандлі, які цяпер распрацоўваецца. Ці папраўкі ў заканадаўства аб рэкламе, што рыхтуюцца да другога чытання. Аднак міністр перасцярог парламентарыяў ад паспешлівых высноў:

— Там усё не так адназначна. Бізнэс ёсць бізнэс...

ЗАКУПЛЯЦЦА Ў ЗАПАС НЕ ВАРТА

Хто з нас апошнім часам не бачыў у краме людзей, якія затаварваюцца, нібы ў апошні раз?! Вось з-за такіх панікёраў паліцы і пустуюць. Няўжо на ўсё жыццё закупішся? Усё адно некалі давядзецца набыць падаражэлае. Прычым запасаецца народ не толькі ежай, але і, на дзіва, бытавой тэхнікай. Беларускія вытворцы толькі паспяваюць адгружаць тавар.

У гутарцы з журналістамі міністр гандлю Валянцін Чаканаў запэўніў, што ажыятажны попыт на спажывецкія тавары, які назіраўся на мінулым тыдні, прайшоў. Паводле ацэнкі міністра гандлю, сёння можна казаць толькі пра павышаны попыт на асобныя групы тавараў. Такія, як крупы, макарона, соль, цукар, воцат, напрыклад.

Міністр гандлю заклікае спажыўцоў не закупляць прадукты ў запас. Маўляў, хвалявацца няма чаго: у Беларусі ўсё ёсць, прадпрыемствы гандлю працуюць у нармальным рэжыме. Формула супакаення, якую можна вывесці з каментарыя міністра: калі нейкі тавар адсутнічае, значыць, яго проста не паспелі падвезці.

Спадар Чаканаў распавёў таксама, што вядуцца перамовы з прамысловымі прадпрыемствамі з тым, каб яны зрабілі дадатковы выпуск некалькіх тысяч СВЧ-печаў, лядоўняў і тэлевізараў, на якіх быў ажыятажны попыт у мінулы тыдзень.

Міністр абверг таксама інфармацыю пра вызначэнне спісу імпарцёраў, якім будзе дазволена пастаўляць спажывецкія тавары ў Беларусь.

— Гэта выдумкі, — заявіў міністр гандлю, — ніякіх пастаноў аб дзяржаўнай манаполіі на імпарт не існуе.

Спадар Чаканаў акцэнтаваў, што Міністэрства гандлю на роўных працуе з прадпрыемствамі як дзяржаўнай, так і недзяржаўнай формы ўласнасці. Ён сцвярджае, што прадстаўнікі бізнэс-супольнасці з разуменнем адносяцца да просьбаў і пажаданняў міністэрства. В.Чаканаў пазітыўна ацэньвае рашэнне Мінгарвыканкама заключыць пагадненне з суб'ектамі гаспадарання аб стрымліванні гандлёвых надбавак.

— Мы сёння павінны быць упэўненымі ў тым, што ў нас ёсць арганізацыі опта, з якімі мы працуем і ў якіх ёсць дастаткова колькасць тавару для пакупнікоў, і мы ў любы час гэты тавар давязём да гандлёвай сеткі.

КАРУПЦЫІ — НЕЦЯРПІМАСЦЬ

Дэпутаты падтрымалі ў першым чытанні папраўкі ў закон аб барацьбе з карупцыяй. Дакумент прадугледжвае новыя захады ў барацьбе з карупцыяй. На думку распрацоўшчыкаў, справе дапаможа крыміналагічная экспертыза законапраектаў, галоснасць у дзейнасці дзяржаўных службоўцаў, інфармаванне насельніцтва, антыкарупцыйныя адукацыя і выхаванне. Асветніцкія захады арыентаваны на тое, каб стварыць «атмасферу нецярпімасці насельніцтва да карупцыі», як выказаўся **Вадзім ІПАТАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў.**

Заканадаўчымі папраўкамі, якія ён прэзентаваў у Авальнай зале, выразна прапісваецца, каго варта адносіць да дзяржаўных службовых асоб і прыраўнаваных да іх.

Да першай катэгорыі прылічылі ўсіх дзяржслужбоўцаў, на якіх распаўсюджваецца дзеянне закона аб дзяржслужбе. З той жа меркай у выпадку чаго будуць падыходзіць таксама да супрацоўнікаў органаў па надзвычайных сітуацыях, унутраных спраў, фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю. У той жа катэгорыі апынуцца і людзі, якія займаюць адказныя пасады ў дзяржаўных арганізацыях і недзяржаўных структурах, у статутным фондзе якіх не менш за 50 адсоткаў даводзіцца на долю дзяржаўнай уласнасці. Да дзяржаўных службовых асоб прылічаны, дарэчы, і дэпутаты парламента, і сенатары.

З другой катэгорыі законапраектам выключаецца шэраг асоб. Так, напрыклад, настаўнікаў і ўрачоў перастануць прыраўноўваць да дзяржаўных службовых асоб, паведаміў Вадзім Іпатаў.

Заканадаўцы імкнуцца таксама перакрыць дарогу здзелкам, дзе замешаны асабісты інтарэс. Дзяржаўным службовым асобам нельга будзе заключыць здзелку (ад імя дзяржаўных арганізацый і недзяржаўных структур з 50-працэнтнай доляй дзяржуласнасці ў статутным фондзе) з уласнымі сужэнцамі, сваякамі — як індывідуальнымі прадпрымальнікамі, так і ўласнікамі маёмасці юрыдычных асоб.

Вадзім Іпатаў назваў нормы беларускага антыкарупцыйнага заканадаўства прагрэсіўнымі. Ён таксама зазначыў, што «нават па ацэнках міжнародных арганізацый мы прасунуліся далёка наперад у параўнанні з краінамі СНД».

Падмацаваннем гэтых слоў могуць быць і статыстычныя звесткі, прыведзеныя **старшынёй Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Ігнаціем МІСУРАГІНЫМ**. У рэйтынгу міжнароднай антыкарупцыйнай арганізацыі «Transparency international» Беларусь за апошнія тры гад паднялася з 151 на 127 месца паводле індэксу ўспрыняцця карупцыі. Для параўнання, Украіна займае там 134-ю, а Расія 154-ю пазіцыю. Цікава, на каго можна раўняцца? Найменш карумпаванымі прызнаны Данія, Новая Зеландыя, Сінгапур — краіны з вельмі неблагімі эканамічнымі паказчыкамі.

— Карупцыя застаецца сур'ёзнай сусветнай праблемай. Сумленнасць пакуль дрэнна сумяшчаецца з цяжкай эканамічнай сітуацыяй, — аналізуе парламентарый. — Сярод дзяржаў, паказчыкі якіх знізіліся за апошні год, — некалькі краін, якія найбольш пацярпелі ад наступстваў фінансава-эканамічнага крызісу.

Барацьба з карупцыяй у Беларусі — традыцыйна сярод прыярытэтаў. Чакаецца, што разгледжаныя заканадаўчыя папраўкі ўдасканаляць гэта супрацьстаянне. Праваахоўнікі тым часам актывізуюцца ў выяўленні карупцыянераў. Так, напрыклад, сёлета за два месяцы выяўлена значна больш фактаў атрымання (77 супраць 45) і дачы (149 у параўнанні з 88) хабараў, пасрэдніцтва ў хабарніцтве (5 супраць 1). Агульны ўрон ад карупцыйных злачынстваў за гэты час, паводле звестак парламентарыя, перасягнуў 9 млрд рублёў.

Паводле інфармацыі спадара Місурагіна, распаўсюджаны факты карупцыі пры здзяйсненні дзяржзакупак, адміністрацыйных працэдур, заключэнні здзелак, у тым ліку звязаных з рэалізацыяй прадукцыі, пры кантрольна-наглядной дзейнасці, пры выдачы розных дазволаў, узгадненняў, іншых афіцыйных дакументаў, у адукацыі — пры здачы экзаменаў і залікаў, а таксама ў зямельных праваадносінах.

Ала МАЧАЛАВА.

У памежных атрадах Беларусі могуць з'явіцца кавалерысты

А вось беспілотныя самалёты патрульваць беларускую мяжу пакуль не будуць

Незвычайны эксперымент праводзяць беларускія памежнікі — увядзенне конных патрулёў на беларускай мяжы. Эксперымент разлічаны на два гады. У тым выпадку, калі ён сябе апраўдае, беларуская памежная служба можа папоўніцца адмысловымі кавалерыстамі.

— Першасная задача, якую мы перад сабой паставілі, — ацаніць мэтазгоднасць і эфектыўнасць конных патрулёў на мяжы, — зазначыў перад журналістамі **старшыня Дзяржаўнага памежнага камітэта Беларусі Ігар РАЧКОЎСКІ**. — За дзень адзін салдат памежнай службы праходзіць каля 30 км — гэта шэсць-сем гадзін хадзьбы. На кані тую ж адлегласць можна пераадолець за гадзіны дзве, а гэта ў тры разы хутчэй. Эканомія сіл — відавочная. Лішак сіл мы можам размеркаваць на іншы ўчастак.

Конныя патрулі ўжо выкарыстоўваюць у Еўропе. У Беларусі пляцоўкамі для эксперыменту былі абраны заставы «Савейкі» (тракенская парода коней і помесь тракенскай і беларускай вапражнай) у Верхнядзвінскім раёне і «Падліпкі» (гановерская парода коней) у Гродзенскім раёне.

— Месца выбіралі з тым разлікам, каб побач быў размешчаны конезавод альбо каняферма, дзе ёсць усе неабходныя ўмовы, у т.л. і ўрачы-ветэрынары, — удакладняе Ігар Рачкоўскі. Зараз у эксперыменце бяруць удзел восем коней: чатыры на заставе Віцебшчыны, астатнія чатыры — на заставе Гродзеншчыны.

Да слова, у Савейках — балоцістая мясцовасць, выкарыстанне квадрацыклаў — надта дарагое задавальненне, за тыя ж грошы працей купіць УАЗік. Нават элементарнае пытанне пра паліва: адзін квадрацыкл — гэта 15 літраў бензіну-92 на 100 км. Іншая справа — конь. Патрэбны «бензін» — каня спыніў, ён травы пад'еў, вады папіў — і паехалі далей. Конь ідзе — яго не чуваць, шум жа ад любой тэхнікі чуваць у лесе за некалькі кіламетраў. Дадатковы плюс у тым, што конь здольны прайсці там, дзе не пройдзе ні чалавек, ні машына.

— Асабіста я бачу ў гэтым будучыню: такія кавалерыйскія заставы будуць з'яўляцца і надалей, — зазначыў старшыня Дзяржпагранкамітэта.

Адказваючы на пытанне журналістаў пра выкарыстанне памежнікамі беспілотных апаратаў, Ігар Рачкоўскі зазначыў:

— У нас былі пэўныя планы на гэты конт, аднак тое канструктарскае бюро, якому мы даручылі праектаванне такога апарата, не выканала тэхнічных задач, якія, згодна з дамовай, абавязалася на сябе ўзяць. Таксама вялася размова пра распрацоўку ўласных «беспілотнікаў». Пакуль што мы не можам знайсці тыя беспілотныя машыны, якія адпавядалі б і якасці, і цане. Тыя ж ізраільскія беспілотныя апараты, хоць і эфектыўныя, але акупнасць у іх будзе гадоў сто, а гэта эканамічна неэфектыўна. Пакуль што мы ўзялі паўзу, але гэта не азначае, што мы адмаўляемся ад такой ідэі.

Ілья ЛАПАТО.

> За парушэнне правілаў знаходжання і транзіту нашымі памежнікамі за мінулы год было затрымана больш за 10 тысяч замежных грамадзян, а за чатыры месяцы гэтага года — 2,7 тысячы.
>
> У выніку прымянення памежнай авіяцыі за чатыры месяцы 2011 года на беларускай мяжы затрымана 10 парушальнікаў, 32 парушальнікі памежнага рэжыму, тавараматэрыяльных каштоўнасцяў канфіскавана на суму больш за Br 19 млн.
>
> Усяго ж за 2010 год беларускую мяжу пераадолелі больш за 26 млн чалавек, а таксама больш за 9,9 мільёна адзінак транспарту. За чатыры месяцы 2011 года — 7,5 млн чалавек і 3,1 млн транспартных адзінак.
>
> Сёння практычна 20 працэнтаў вайскоўцаў на пасадах сяржантаў і салдат праходзяць ваенную службу па кантракце.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВАЙНЫ АТРЫМАЎ ДАКЛАДНУЮ КОПІЮ СЦЯГА ПЕРАМОГІ

Дакладную копію Сцяга Перамогі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны атрымаў ад Цэнтральнага музея Узброеных Сіл Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Цырымонія перадачы адбылася на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь: гісторыя і сучаснасць», якая праходзіць у Мінску 25-27 мая.

— Гэта дакладная копія штурмавога сцяга, які ўвайшоў у гісторыю як Сцяг Перамогі, — тлумачыць **Аляксандр НІКАНАЎ, дырэктар Цэнтральнага музея Узброеных Сіл Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі**. — Сам Сцяг Перамогі паступіў нам на вечнае захоўванне 22 чэрвеня 1945 года і па сёння знаходзіцца ў Цэнтральным музеі Узброеных Сіл. Сцягоў было зроблена 9 экзэмпляраў, але толькі сцяг пад нумарам 5 увайшоў у гісторыя як Сцяг Перамогі, бо ён быў першы ўстаноўлены на дах рэйхстага і да 20 мая знаходзіўся на купале.

Што тычыцца дакладных копій Сцяга Перамогі, то перададзеная ў Мінск копія з'яўляецца дзявятай па ліку:

— За ўсю гісторыю было зроблена толькі 9 копій Сцяга Перамогі. Першая копія экспанавалася ў нашым Цэнтральным музеі Узброеных Сіл; другая выносілася на парады, дні вайсковай славы, на мерапрыемствы; трэцяя копія выкарыстоўвалася ў экспазіцыйнай працы; чацвёртая была прэзідэнтам РФ Барысам Ельцыным у 1996 годзе ўручана музею Брэсцкая крэпасці; пятую копію міністр абароны РФ уручыў міністру абароны Украіны ў мінулым годзе; шостая зроблена для парада Перамогі; сёмая ў мінулым годзе была дастаўлена на Эльбрус (самую высокую кропку Еўропы) і зараз знаходзіцца ў музеі Кабардына-Балкарыі; восьмая нядаўна была перададзена ў Цэнтральны музей Вялікай Айчыннай вайны на Паклоннай гары. І вось было прынята рашэнне зрабіць спецыяльную копію №9, якая сёння перадаецца Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, — сказаў Аляксандр Ніканаў.

У сваю чаргу, **дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі ВАВ Сяргей АЗАРОНАК** паабяцаў, што копія Сцяга Перамогі стане галоўным экспанатам залы Перамогі ў новым музеі вайны:

— Копія будзе выстаўлена ў зале Перамогі, і гэта будзе экспанат №1 у экспазіцыі. Вельмі сімвалічна, што копія Сцяга Перамогі перадаецца менавіта падчас правядзення канферэнцыі і ў год 70-годдзя нападу нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Савецкі Саюз. Гэты Сцяг Перамогі ставіць усе кропкі над «і» — мы, беларусы, як і расійскі народ, з'яўляемся пераможцамі.

Скарыстаўшыся выпадкам, газета «Звязда» пацікавілася ў дырэктара Цэнтральнага музея Узброеных Сіл Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі пра тое, як сёння ў Расіі моладзь ставіцца да тэмы Вялікай Айчыннай вайны:

— Я ўжо даўно працую ў музеі і бачу, што моладзь цікавіцца такой тэмай, асабліва ў апошні час. З'яўляюцца пачуцці гордасці, павагі — узяць хоць бы тую ж самую акцыю з георгіеўскай стужкай... Актывізацыя ваенна-патрыятычнай працы ў апошні час паспыняла таму, што моладзь стала ставіцца да тых падзей больш трапятліва. Тым не менш, мы назіраем, асабліва ў школьнікаў, што моладзь забывае гісторыю. Пытаеш у дзяцей, якія ў 3-5 класах вучацца: «Калі пачалася вайна?» І не кожны адкажа. Таму мы стараем залы музейнай педагогікі, інтэрактыўныя залы, дзе спрабуем неяк давесці да іх гістарычныя веды, каб яны ведалі гісторыю сваёй краіны. Не сакрэт, што зараз маладыя людзі мала чытаюць — яны ў асноўным атрымліваюць інфармацыю візуальна або праз кароткія тэксты. Таму мы стараемся даваць менш тэксту, а больш візуальных эфектаў, каб усё добра запаміналася. Але ў той жа час мы выдаём і зборнікі, і кнігі. Дарэчы, для выкарыстання новых тэхналогій трэба мець сродкі. Вядома, у нас і праектары ёсць, і камп'ютары, і зараз мультымедыйныя кіёскі ставім, віртуальны музей ёсць — мы ўсё гэта спрабуем укараніць, але катастрафічна не хапае грошай. Паціху рухаемся напярод, стараемся не адставаць ад іншых музеяў. Але ёсць іншы момант — зараз музейшчыкі абмяркоўваюць такую тэму: не трэба ствараць розныя віртуальныя музеі — як, маўляў, хадзіць па Луўры, седзячы ў сябе за камп'ютарам? Безумоўна, яны патрэбны, калі ты жывеш на Камчатцы, а табе хочацца паглядзець, што захоўваецца ў цэнтральным музеі Узброеных Сіл. Але чым адрозніваецца музей ад іншых устаноў — напрыклад, кінатэатраў? Бо ў музеі знаходзяцца арыгіналы.

— А ці шмат наведвальнікаў звычайна ў вашым музеі?

— У памятныя даты асабліва шмат, а так стабільна нармальная наведвальнасць. Няма такога правалу наведвальнікаў, які назіраўся ў пачатку 90-х гадоў. Тады народ быў заняты іншым. Зараз наадварот людзі ідуць — нават іншаземцы прыязджаюць.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Online-канферэнцыя

ПАЛОВА СТАЎКІ ВОДПУСК НЕ ЗМЯНШАЕ

Не сакрэт, што якасць працы не ў апошнюю чаргу залежыць ад адпачынку. Права на водпуск у нашай краіне мае абсалютна кожны работнік. І тым не менш практыка сведчыць: пытанняў тут традыцыйна шмат. Таму менавіта тэме водпускаў і была прысвечана чарговая інтэрактыўная канферэнцыя Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — з удзелам намесніка міністра Ігара Рыгоравіча СТАРАВОЙТАВА, начальніка юрыдычнага ўпраўлення Валянціны Уладзіміраўны МАСЛОЎСКАЙ, а таксама галоўнага юрысконсульта аддзела працоўнага заканадаўства юрыдычнага ўпраўлення Таццяны Валер'еўны РАБУХІ.

@ Якім чынам прадастаўляецца водпуск за другі і наступныя гады працы?

— Паводле заканадаўства, асноўны і дадатковы працоўны водпуск за другі і наступныя гады працы прадастаўляецца, як правіла, штогод у адпаведнасці з графікам водпускаў. Пры гэтым такі графік вызначаецца наймальнікам пасля ўзгаднення з прафсаюзам, а пры адсутнасці прафсаюза — па ўзгодненні непасрэдна з работнікам.

@ Пры якіх умовах магчыма пераносіць працоўны водпуск на наступны год?

— Ёсць дакладная норма: наймальнік прадастаўляе працоўны водпуск, як правіла, на працягу працоўнага года. Заканадаўства дапускае перанос часткі водпуску на наступны год толькі ў двух выпадках — у сувязі з вытворчай неабходнасцю ці ў выпадках адклікання з водпуску. Аднак тут ёсць некаторыя нюансы.

Скажам, у выпадку вытворчай неабходнасці перанос дапускаецца толькі са згоды работніка і толькі часткова — не менш за 14 каляндарных дзён водпуску прадастаўляецца менавіта да заканчэння бягучага працоўнага года. Частка водпуску, якая пераносіцца, па жаданні работніка далучаецца да водпуску за наступны год або выкарыстоўваецца асобна. Пры гэтым забараняецца непрадастаўленне працоўнага водпуску работнікам ва ўзросце менш за 18 гадоў і работнікам, якія маюць права на дадатковы водпуск за шкодныя ці небяспечныя ўмовы працы.

Што ж да адклікання з водпуску, то такі варыянт таксама немагчымы ў дачыненні да работнікаў ва ўзросце да 18 гадоў, і работнікаў, якія заняты ў шкодных ці небяспечных умовах. Адкліканне з водпуску робіцца зноў жа са згоды работніка. Нявыкарыстаная ж частка водпуску, паводле дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам, тут прадастаўляецца да канца бягучага працоўнага года, далучаецца да водпуску за наступны працоўны год або кампенсуецца ў грашовай форме.

@ На колькі частак можна дзяліць працоўны водпуск?

— Цяпер працоўны водпуск дзеліцца максімум на дзве часткі, прычым адна з іх не можа быць меншай за 14 каляндарных дзён. Варыянт падзелу водпуску на тры ці больш частак магчымы толькі пры адной умове — калі падобная норма замацавана ў калектыўным дагаворы ці пагадненні арганізацыі.

@ Пры якіх умовах дазваляецца замена водпуску грашовай кампенсацыяй?

— Заканадаўства дазваляе замяняць частку водпуску, якая перавышае 21 каляндарны дзень, пры ўмовах адпрацоўкі поўнага працоўнага года, працягу працоўных адносін пасля заканчэння водпуску, а таксама — пры двухбаковай дамоўленасці аб кампенсацыі паміж работнікам і наймальнікам. Да таго ж трэба мець на ўвазе: забараняецца замяняць грашовай кампенсацыяй водпускі, якія былі прадастаўлены авансам, водпускаў цяжарным жанчынам, водпускаў работнікам-інвалідам і работнікам ва ўзросце менш за 18 гадоў, работнікам, якія заняты ў зонах радыеактыўнага забруджвання, а таксама водпускаў за працу ў шкодных, небяспечных ці асаблівых умовах.

@ Ці можа наймальнік задаволіць просьбу аб прадастаўленні работніцы водпуску без захавання зарплаты ад моманту выхаду з «дэкрэтнага» да моманту дасягнення дзіцем 5-гадовага ўзросту — з улікам таго, што дзіця з'яўляецца інвалідам?

— Паводле Працоўнага кодэкса, наймальнік абавязаны прадаставіць водпуск працягласцю да 14 каляндарных дзён пры жаданні асобных катэгорый работнікаў, і ў тым ліку жанчын, якія маюць двух ці больш дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў ці дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Апроч таго, па ўзгодненні з наймальнікам работніку можа прадастаўляцца не больш чым 30 каляндарных дзён водпуску без захавання зарплаты па сямейна-бытавых прычынах.

Адпаведна, у такой сітуацыі работніку на працягу года можа быць прадастаўлена да 44 дадатковых «выхадных» без захавання зарплаты. Гэты тэрмін можа быць павялічаны непасрэдна калектыўным дагаворам ці пагадненнем арганізацыі. Разам з тым, трэба заўважыць: магчымасць прадастаўлення водпуску «за свой кошт» працягласцю ў два гады заканадаўствам не прадугледжана.

@ Ці маюць права наймальнік прадаставіць працоўны водпуск цяжарнай жанчыне, калі за апошні працоўны год такая жанчына адпрацавала толькі 3 месяцы?

— Пытанне аб прадастаўленні працоўнага водпуску перад водпускам па цяжарнасці і родах трэба вырашаць шляхам пагаднення з наймальнікам. У прыватнасці, у такой сітуацыі наймальнік можа прадаставіць працоўны водпуск авансам.

@ Ці могуць звольніць работніка, які вырашыў выкарыстаць свой дадатковы сацыяльны «чарнобыльскі» водпуск без узгаднення з наймальнікам?

— Могуць. Самавольнае, без афармлення адпаведнага загаду, выкарыстанне адгулаў ці самавольны ўход у працоўны або сацыяльны водпуск з'яўляецца прагулам. І тут магчыма звальненне менавіта з такой матывіроўкай.

@ Як уключаюцца ў працоўны год два месяцы знаходжання ў сацыяльным водпуску?

— Сітуацыя тут такая. Калі сацыяльны водпуск быў прадастаўлены з частковым захаваннем зарплаты, то ў працоўны год ён уключаецца цалкам. А калі сацыяльны водпуск быў прадастаўлены без захавання зарплаты, то ў працоўны год залічваецца толькі 14 каляндарных дзён. Разам з тым, уключэнне ў працоўны год усяго перыяду знаходжання ў сацыяльным водпуску без захавання зарплаты можа быць прадугледжана ў калектыўным дагаворы ці пагадненні арганізацыі.

@ Ці абавязаны наймальнік прадаставіць сацыяльны водпуск без захавання зарплаты студэнту-завочніку?

— Працоўны кодэкс вызначае, што наймальнік абавязаны прадаставіць вучэбны водпуск з захаваннем зарплаты работнікам, якія атрымліваюць першую сярэднюю спецыяльную ці першую вышэйшую адукацыю і пры гэтым паспяхова навучаюцца на вячэрняй ці завочнай форме, пры наступных умовах — наяўнасці накіравання таго ж наймальніка, дагавора на падрыхтоўку спецыяліста або пры наяўнасці адпаведных падстаў, вызначаных у калектыўным ці працоўным дагаворы.

Пры адсутнасці ж накіравання наймальніка, дагавора на падрыхтоўку спецыяліста, адсутнасці адпаведных падстаў, вызначаных у калектыўным ці працоўным дагаворы, а таксама пры атрыманні другой і наступных сярэдняй спецыяльнай ці

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

26 мая 2011 г. № 18 (256)

МЯСЦОВЫ ЧАС

Самая-самая?

Альшаны называюць самай вялікай, самай багатай і... самай праблемнай вёскай Столінскага раёна... Бо з аднаго вынікае другое. Як жа гэта — кіраваць «самай-самай»? Пра гэта расказаў старшыня Альшанскага сельскага Савета дэпутатаў Віктар ГАПКО.

— Зараз як ніколі трымаем на кантролі пытанні навядзення парадку, — расказвае Віктар Анатольевіч. — Распрацаваны мерапрыемствы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў сельсавета. Мы стварылі рабочую групу па падрыхтоўцы і правядзенні адпаведных мерапрыемстваў. За кожнай арганізацыяй, установай, прадпрыемствам, камерцыйнай структурай замацавана прылеглая тэрыторыя.

Асноўная наша праблема — гэта ўтрыманне могілак, якія своечасова не прыбіраюцца, зарастаюць бур'яном. Жыхары Альшан не лічаць неабходным утрымліваць іх у чысціні. Смецце і вянкі выкідаюць каля агароджы, але не складваюцца ў адведзеных месцах. Члены выканкама, дэпутаты, члены санітарнай камісіі, участковыя інспектары вядуць растлумачальную работу з насельніцтвам. Мы вывешваем аб'явы з просьбамі, нашы паведамленні паштальёны разносяць з газетамі па дамах... Аб'явы аб прыборцы вуліц робяцца на сходах у царкве. Аднак многія грамадзяне проста ігнаруюць патрабаванні сельвыканкама. Ды не толькі прадпісанні, але і пратаколы. Летась іх было складзена 39, накладзены штрафы больш чым на тры мільёны рублёў. За тры месяцы гэтага года складзена два пратаколы і 49 папярэджанняў. Аднак не ўсе грамадзяне заплацілі штрафы. Мы перадалі гэтыя справы ў суд, але і суд утрымаў штрафы толькі з пенсіянераў і працуючых. А непрацуючыя застаюцца непакаранымі.

— Вельмі хочацца, каб вёска была самай прыгожай, самай чыстай і самай утульнай, — кажа кіраўнік мясцовай улады. — Але толькі намаганнямі ўсіх жыхароў мы зможам гэта зрабіць.

Таццяна СЕГЕН.

Столінскі раён.

ТУРЫЗМ: ТЭОРЫЯ НА ПРАКТЫЦЫ

На выязным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні, якое прайшло днямі на Лідчыне, разглядалася праблема развіцця турызму ў рэгіёне.

Цана пытання...

Экскурсію па гасцінічна-сэрвісным турыстычным цэнтры «Кантынент» (з «трохзорнай» гасцініцай) і фізкультурна-аздараўленчым цэнтры «Экватар» (з гасцініцай эканом-класа) правёў **дырэктар філіяла №1 сумеснага закрытага акцыянернага таварыства «Ліпласт-СПб» (якому належаць абодва згаданыя комплексы) Віталь САВЕНКАЎ**.

Ён расказаў, што за 3,5 года існавання гасцініцы «Кантынент» яе паспелі наведаць 5,5 тысячы кліентаў. З іх 45 працэнтаў — замежныя грамадзяне з 51 краіны свету. Агульная выручка, атрыманая гасцініцай, склала 500 тыс. доларaў.

— У асноўным у нас спыняюцца дзелавыя партнёры лідскіх прамысловых прадпрыемстваў, — дадаў дырэктар філіяла, — аднак апошнім часам актывізаваліся і звычайныя турысты. У прыватнасці, мы паспелі папрацаваць з немцамі, датчанамі і інш. У нас заключаны кантракты з 15 турфірмамі, у тым ліку з польскімі і расійскімі. Першапачаткова, калі дзейнічала толькі гасцініца «Кантынент», у нас была праблема абмежаванасці плошчаў, мы не маглі прымаць турыстаў вялікімі групамі — напрыклад, па 45 чалавек. Для выпраўлення сітуацыі была пабудавана гасцініца «Экватар». Цяпер маем магчымасць прымаць і аўтобусныя туры. У канцы 2010 года сумесна з адной турфірмай мы правялі 2 такія туры — «Навагодні» і «Калядныя канікулы».

Для таго, каб павялічыць прыток турыстаў, «Ліпласт-СПб» правёў «лікбез» для замежных турфірмаў. Іх дырэктараў запрасілі ў госці, арганізавалі для іх адпачынак з беларускім нацыянальным каларытам: вывозілі на аграсядзібы, каталі на конях, знаёмілі з фальклорам. Кіраўнікі засталіся задаволеныя, што павінна станоўча адбіцца на колькасці замежных турыстаў, якія наведаюць Лідчыну.

— Калі распрацоўвалі фальклорную праграму, сутыкнуліся з пэўнымі цяжкасцямі, — кажа Віталь Савенкаў. — Зразумела, калі прыязджаюць замежнікі, яны хочуць бачыць Беларусь самабытную, а не «еўрарамонт». Іх у першую чаргу цікавіць экзотыка, вёска. Нават прыбіральня на вуліцы для іх — дзіва. Аднак сельсаветы не могуць у поўным аб'ёме аказаць тыя платныя паслугі, якія сёння запатрабаваны турыстамі. Напрыклад, запрасіць гарманіста і г.д. Нам прасцей аплаціць ім такія паслугі, толькі арганізуйце, але з гэтым пакуль цяжкасці.

Быў у нас егіпцянін, якому спадабалася ў аграсядзібе катацца на кані. Я пацікавіўся: няўжо ў вас там няма коней? Аказалася, што ў іх там — арабскія скакуны, і пракаціцца на іх каштуе шалёных грошай. А ў вас, сказаў ён, гэта амаль бясплатна. Мы яго амаль гадзіну не маглі з каня зняць.

Віталь Савенкаў агучыў праблемы, якія, па яго перакананні, абмяжоўваюць развіццё гасцінічнага бізнэсу. І першая з іх — датычыцца сертыфікацыі.

— Сёння мы гатовыя сертыфікаваць гасцініцу «Экватар», прайшлі папярэдні этап. Цана пытання — 4 мільёны рублёў штогод толькі за тое, што ў цябе ёсць сертыфікат. Па гасцініцы «Кантынент» мы ў год плацім 2,2 мільёна рублёў. Калі б сертыфікат адпаведнасці выдаваўся хаця б на 3 гады, гэта было б нармальна. А так кожны год неабходна пацвярджэнне: нас правяраюць, ці падтрымліваем мы якасць паслуг на заяўленым узроўні. Гэта затратна.

Фота БЕЛТА.

Гаспадары аграсядзібы «Над Нёманам» Аксана і Валерый САЛЬКОЎСКІЯ.

Другое пытанне тычыцца канкурэнцыі з мясцовымі жыхарамі, фізічнымі асобамі, якія здаюць жылплошчы. Мы, як структура, гарантуем пажарную, санітарную бяспеку, узровень сэрвісу, ахову і інш. — у адпаведнасці з нормамі і сертыфікатамі. «Прыватнікі» абыходзяцца без гэтага. Калі ў нас ложка-месца каштуе 65 тысяч рублёў, яны выстаўляюць 40 тысяч і адцягваюць значны працэнт кліентаў (у Лідзе — каля 20 працэнтаў рынку). Яны плацяць толькі фіксаваны падатак, а мы — паўнавартасныя падаткі (на дабаўленую вартасць, на прыбытак і г.д.). Канкурэнцыя павінна базіравацца на роўнасці ўмоў. Напрыклад, сёння мы абавязкова павінны мець у штаце чалавека, які валодае замежнымі мовамі, каб кантактаваць з замежнікамі. Зразумела, што ўсё гэта закладаецца ў цану.

...Цікава, што канкурэнцыя з гасцініцамі камунальнай уласнасці Віталя Савенкава не палохае, нягледзячы на тое, што пры падрыхтоўцы да леташніх рэспубліканскіх «Дажынак» у цэнтры з'явілася гарадская гасцініца «Ліда», і аўтар артыкула на ўласныя вочы пераканаўся ў высокім узроўні камфортнасці яе нумароў. Аднак дзеля справядлівасці трэба прызнаць, што «Кантынент» і «Экватар» нічым ёй не саступаюць. І цана крыху ніжэй: аднамесны нумар у «Экватары» каштуе 80 тысяч рублёў, а ў «Лідзе» — 81 600.

«Фішка» — далікатэсы беларускай знаці

У цэнтры рамёствaў «Сябрына» турысты могуць набыць сувеніры, частка з якіх вырабляецца ў прысутнасці кліента, а пры жаданні — і пры яго ўдзеле. Тут прапануюцца майстар-класы па пляценні з саломы, выразанні выцінанак, ганчарнай справе. Пры цэнтры працуе рэстаран нацыянальнай кухні, дзе можна паласавацца традыцыйнымі беларускімі прысмакамі. А яшчэ лепш — завітаць у гасцінічны комплекс «Гасціны Двор». Раней гэты быў звычайны магазін райпа, размешчаны ля трасы, але да рэспубліканскіх «Дажынак» яго пераўтварылі ў аб'ект прыдарожнага сэрвісу. Сёння гэта кавярня на 48 месцаў і гасцініца на 5 нумароў.

Працуе ў «Гасціным Двары» 24 чалавекі (кухары, афіцыянты, служба аховы і г.д.). Сярэднямесячны таваразварот аб'екта — 90 млн рублёў, што ў 5 разоў больш, чым было да рэканструкцыі. Заробак работнікаў — у сярэднім 924 тысячы рублёў. Аб'ект прыбытковы. Фінансавы вынік першага квартала (чысты прыбытак) склаў 24 млн рублёў, і гэта не мяжа.

«Фішкай» аб'екта з'яўляюцца нацыянальныя стравы беларускай кухні, у склад якіх уваходзіць мяса дзічыны (заключаны дагавор з таварыствам рыбаловаў і паляўнічых на яе пастаўку). Прапануюць гасцям стравы з мясам лася, дзіка, дзікай казы і інш. Далікатэсы, якія з'яўляліся на сталах беларускай знаці, сёння ёсць у меню кавярні, — патлумачыла старшыня праўлення Лідскага райспажыўтаварыства Ірына Уласенка.

На развіцце гаспадыня прапанавала гасцям традыцыйны напой шляхты Вялікага Княства Літоўскага — безалкагольную саладуху, выраблену з натуральных прадуктаў на аснове жытняй мукі. Яе старажытны рэцэпт захоўваецца нязменным і з'яўляецца камерцыйнай тайнай.

Аграturызм — усёй вуліцай

Апошнім аб'ектам выязной праграмы стала аграсядзіба «Над Нёманам» (крайні дом на вуліцы Левабярэжнай у населеным пункце Бярозаўка). Гасцей сустракалі **гаспадары Аксана і Валерый САЛЬКОЎСКІЯ**, якія неаднойчы станавілася пераможцамі абласнога і рэспубліканскага конкурсаў на лепшую аграсядзібу.

— Пачыналі мы з адной хаты, — патлумачыла Аксана. — Але пакольк госці пачалі раіць прыехаць сюды сваім родным, хутка стала не хапаць месца. Мы дабудавалі яшчэ адзін дом, пашырылі свае магчымасці. Цяпер адначасова можам прыняць 8—10 чалавек.

На гэтай жа вуліцы жывуць мае маці і бабуля, і брат з сям'ёй. Ды і ўсе нашы суседзі, лічыце, таксама родзічы, бо мы ў іх бяром мяса, сала, агуркі (калі сваіх не хапае). Акрамя таго, суседзі вяжуць нашым гасцям тапкі, камізэлькі, таму можна сказаць, што ўся наша вуліца ўдзельнічае ў сельскім турызме.

Валерый нарадзіўся ў Барысаве, у свой час скончыў кансерваторыю (іграе на домбры і гуслях), стаў лаўрэатам міжнародных музычных конкурсаў. Разам з сябрам паездзіў па Еўропе, зарабляючы музыкай грошы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПРАМОЕ ДЗЕЯННЕ ЗАКОНА

У першыя гады існавання Беларусі як незалежнай дзяржавы, на этапе актыўнага фарміравання нацыянальнага заканадаўства, законапраекты часта жорстка крытыкаваліся, блакіраваліся, адпраўляліся на перапрацоўку. Доля «забракаваных» членамі Савета Рэспублікі праектаў дасягала 4,5-5 працэнтаў ад агульнай колькасці. Аднак з часам парламентарыі, так бы мовіць, набілі руку, павысілася якасць і папярэдняй распрацоўкі дакументаў, якія накіроўваюцца на разгляд у верхнюю палату.

З гэтага пачаў сваё выступленне перад слухачамі курсаў павышэння кваліфікацыі Інстытута дзяржслужбы, старшынямі Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Яўген СМІРНОЎ**.

Ён адзначыў, што ў цэлым заканадаўчая база ў нашай краіне ўжо сфарміраваная, і нагадаў зварот кіраўніка дзяржавы да парламентарыяў: не зацыклівацца бясконца на заканатворчасці, а засяродзіцца на ўдасканаленні таго, што ўжо ёсць.

Законы павінны мець прамое дзеянне. Калі ж закон мае пастаянныя адсылкі на дзейнае заканадаўства ці змяшчае даручэнні пэўным структурам нешта дапрацаваць (прыняць дадатковыя інструкцыі, тлумачэнні, каментарыі і г.д.), гэта паніжае ўзровень яго якасці.

— Сёння ў краіне існуе каля 18 тысяч падзаконных актаў: правілаў, інструкцый, тлумачэнняў, палажэнняў, нормаў і г.д. Гэта вялікі мінус.

Спробы ўдасканалення заканадаўства былі ва ўсе часы. Самым справядлівым ва ўсім свеце сёння лічыцца сацыяльна арыентаванае заканадаўства. Калі заканадаўства ўспрымецца народам, дзяржаве забяспечана стабілізацыя, адзначыў Яўген Смірноў.

Заканадаўства павінна быць максімальна зразумелым, падкрэсліў ён і ўзгадаў прыняты напрыканцы мінулага года Кодэкс аб адукацыі, ахарактарызаваўшы яго як вельмі складаны дакумент. Паводле слоў Яўгена Смірнова, Кодэкс не быў абмеркаваны належным чынам у грамадстве. Пры тым, што ў нашай краіне працуе вялікая армія выкладчыкаў і літаральна ў кожнага з іх — свой погляд на праблематыку, свая пазіцыя.

Цікава, што самым простым і зразумелым у нас з'яўляецца Крымінальны кодэкс. Аднак і тут ёсць што ўдасканальваць. Некалі ў нас існавала ўсяго 220 артыкулаў крымінальнага заканадаўства, сёння — пад 500. У выніку, чым больш асуджаецца людзей, тым больш крыміналізуецца краіна, што адмоўна ўплывае на яе рэпутацыю на міжнароднай арэне. Уражвае і наш Адміністрацыйны кодэкс, у адпаведнасці з якім ледзь не кожны крок грамадзяніна падпадае пад адміністрацыйную адказнасць. Адсюль вынікае, што яшчэ адна з формаў удасканальвання заканадаўства — яго перагляд у бок дэкрымінералізацыі. Заканадаўства павінна стаць больш чалавекалюбным, але з пэўнымі абмежаваннямі. За першыя чатыры дні месяца толькі па Мінску і Мінскай вобласці за знаходжанне за рулём у нецвярозым стане было затрымана 1430 чалавек. Ніякага апраўдання для такіх асоб быць не можа. П'яны за рулём — патэнцыйны забойца, — сказаў Яўген Смірноў.

Ён таксама звярнуў увагу на тое, што ў нас пакаранне за ўсе цяжкія злачынствы, якія датычыліся прадпрымальніцтва, заўсёды прадугледжвала канфіскацыю маёмасці. Прычым без падзелу на тое, што было зароблена сумленнай працай, і тое, што было атрымана дзякуючы злачыннаму даходу.

— Але Прэзідэнт параіў больш асцярожна ставіцца да канфіскацыі і тое, што атрымана сумленным шляхам, не чапаць. Пакуль што гэта не ўвасобілася ў законе, але, аналізуючы судовую практыку, я бачу, што суддзі пачалі да гэтага пытання ставіцца больш уважліва.

Пытанне ўласнасці — адно з самых балючых, падсумаваў выступоўца, а з улікам узятага курсу на прыватызацыю дзяржмаёмасці яно набывае вельмі важнае значэнне.

Інга МІНДАЛЁВА.

ДРУГАЯ МАЛАДОСЦЬ СТАРОГА ПАРКУ

Тут цяпер ёсць новыя атракцыёны, адкрыццё якіх доўгімі дзесяцігоддзямі чакалі гараджане. Дарэчы, катанне на іх — па даступных цэнах. Як калісьці, арганізуюцца культурныя праграмы.

На ўскраіне Віцебска, на беразе Заходняй Дзвіны, у парку адпачынку імя Савецкай Арміі сёлета пасля доўгага перапынку ўсталявалі новыя атракцыёны. З мясцовага бюджэту на набыццё шасці стацыянарных атракцыёнаў выдзелілі звыш мільярда рублёў. Сёлета дадаткова 270 мільёнаў рублёў патрацілі на мантаж арэляў, каруселяў і добраўпарадкаванне. Дарэчы, цэны на катанне на атракцыёнах, у параўнанні з часовымі луна-паркамі на колах, якія прыязджаюць у Віцебск у цёплы час года, у 2-3 разы меншыя.

Як адзначыў генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры «Віцебск» Радзівон Бас, новы сезон адпачынку адкрыўся ў комплексе культурна-масавага адпачынку пад дэвізам: «Парк зноў збірае сяброў». Мэта — зрабіць парк, які калісьці быў вельмі папулярным месцам адпачынку гараджан, такім жа папулярным. Разнастайная культурная праграма, добра арганізаваны гандаль прывабліваюць у парк усё больш наведвальнікаў. Дзякуючы падтрымцы з боку кіраўніцтва не толькі гарвыканкама, але і аблвыканкама парк цяпер перажывае другую маладосць. Праведзены яго добраўпарадкаванне, арганізаваны пракат ролікавых канькоў, веласіпедаў, самакатаў. Тут можна атрымаць асалоду ад бадмінтона і іншых спартыўных гульняў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

КАДРАВЫ ДЫСБАЛАНС

Прыехаць па размеркаванні і... застацца. Што для гэтага неабходна?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Самая вялікая наша праблема — гэта кадры, — сказаў старшыня Нараўлянскага райвыканкама Валерый Шляга падчас размовы з удзельнікамі выязнога семінара, арганізаванага Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання.

Сказаў — з болем, з жалем — пра тое, што ў раёне не затрымліваюцца настаўнікі і ўрачы. Па размеркаванні яны сюды прыязджаюць, але вялікага замацавання няма. Адпрацоўваюць людзі неабходны тэрмін, набываюць кваліфікацыю і... адбываюць у месцы больш перспектыўныя і больш чыстыя ў параўнанні з пацярпелым ад чарнобыльскай катастрофы Нараўлянскім раёнам.

— Праблема не толькі ў тым, што ад'язджаюць спецыялісты, а ў тым, што вёска застаецца без інтэлігенцыі. Сёння там практычна няма праслойкі людзей, якія маглі б уносіць у жыццё «разумнае, добрае, вечнае». І гэта, на жаль, адбіваецца на ўсім.

Занепакоенасць кіраўніка раённай улады зразумелая. Перыяд працягласцю ў дваццаць пяць гадоў, калі раён з дапамогай адпаведных дзяржаўных праграм паслядоўна пераадольваў наступствы катастрофы (і працягвае пераадольваць іх цяпер), наклаў моцны адбітак на псіхалогію людзей — перш за ўсё тых, якія прыязджаюць сюды з іншых рэгіёнаў. Маладыя спецыялісты — не выключэнне... Вось чаму так заўзята выступае за змену іміджу сваёй тэрыторыі Валерый Шляга, вось чаму настойліва прапаноўвае перагледзець назву адпаведнай дзяржаўнай праграмы: замяніць словазлучэнне «мінімізацыя наступстваў катастрофы» на больш пазітыўнае «сацыяльна-эканамічнае адраджэнне пацярпелых тэрыторый».

Увогуле, гэтая тэма — як затрымаць у раёне маладых спецыялістаў, тых жа медыкаў, — заслугоўвае асобнай размовы.

— Рэч не ў тым, што выпускнікі медыцынскіх навучальных устаноў сюды не размяркоўваюцца: і размяркоўваюцца, і прыязджаюць, тут праблем няма. Але праз два гады, прайшоўшы праз нашу «школу», атрымаўшы практычныя навыкі, навучыўшыся працаваць, яны ў большасці сваёй ад'язджаюць — у Мінск, у Гомель, у іншыя гарады з развітай эканамічнай базай і сацыяльнай інфраструктурай, — кажа **галоўны ўрач Нараўлянскай цэнтральнай раённай бальніцы Яўген ТОПЧЫ**. — Мы ўжо часам жартуем, што наш раён ператварыўся ў своеасаблівы «палігон», «трэніровачную базу» для маладых спецыялістаў з усёй рэспублікі! Але жарт атрымліваецца сумны.

Цяжка не пагадзіцца з гэтым. Як і з тым, што галоўным суб'ектам медыцынскай дапамогі, яе асновай, «адпраўным пунктам» з'яўляецца ўсё ж урач. Можна набудаваць бальніц і паліклінік, абсталяваць іх найноўшай медапаратурай, узброіцца самымі сучаснымі тэхналогіямі... Але на новым абсталяванні і ў новых медустановах павінны працаваць людзі.

— І калі з сярэднім медперсаналам у нас праблем няма, тут мы ўкамплектаваныя на 100 працэнтаў, то з урачамі заўсёды ўзнікалі пытанні, — кажа Яўген Топчы. — Прычым не столькі з камплектацыяй штату, колькі з наступным замацаваннем медыцынскіх кадраў на нашай тэрыторыі.

Праблема не новая, і характэрная яна не толькі для Нараўлянскага раёна. І ў сталічных медустановах (тых жа раённых паліклініках) спецыялісты часам мяняюцца з такой хуткасцю, што не паспяваеш нават запамінаць іх прозвішчы.

— Сапраўды, дэфіцыт медыцынскіх кадраў ёсць паўсюдна — і ў Жлобіне, і ў Гомелі, і ў Мінску, — пагаджаецца Яўген Мікалаевіч. — Але ж вы параўнайце прэстыжнасць працы ўрача ў той жа абласной бальніцы і ў нашай, Нараўлянскай. І дадайце сюды фактар пражывання ва ўмовах забруджанай тэрыторыі...

Кампенсаваць гэтыя «мінусы» можна было б з дапамогай дадатковага матэрыяльнага стымулявання. Менавіта матэрыяльная матывацыя магла б, на думку Яўгена Топчага, адыграць галоўную ролю падчас прыняцця маладым спецыялістам канчатковага рашэння: з'ехаць адсюль ці застацца тут надоўга? Але рэаліі такія, што нават з улікам «чарнобыльскай надбаўкі» (даплаты да акладу, якая ў сярэднім складае 50 працэнтаў), сярэднестатыстычная зарплата ўрача ў Нараўлянскім раёне адстае ад заробкаў яго абласных і сталічных калег.

— Відавочна, што праца медыкаў у зоне забруджвання павінна і заахвочвацца адпаведна. Калі ўрач будзе атрымліваць, умоўна кажучы, не 1,5 мільёна рублёў, а 3 мільёны, ён, хутчэй за ўсё, забудзецца пра пераезд у сталіцу ці куды-небудзь яшчэ, — лічыць Яўген Топчы.

У прынцыпе, пра востры «кадравы голад» (калі мець на ўвазе медыкаў) гаворка ў Нараўлянскім раёне не ідзе. Урачы тут застаюцца і «прыжываюцца» па розных прычынах: «урастаюць» у калектыў, прызвычайваюцца да пэўнага ладу і рытму жыцця, абзаводзяцца сем'ямі, сябрамі... Немалаважную ролю адыгрывае і тое, што кожнаму маладому спецыялісту абавязкова выдзяляюць службовае жыллё — асобнае, з усімі выгодамі. Гэта пытанне даўно вырашана з райвыканкамам, і праблем тут не ўзнікае. Праўда, прыватызаваць службовую кватэру нельга. Можна толькі ўзяць крэдыт на будаўніцтва новай — гэта толькі вітаецца. Але будавацца рашаецца далёка не кожны: зноў жа, усё «ўпіраецца» ў фінансы...

Сёлета ў раён прыязджае трое маладых спецыялістаў, у наступным годзе чакаюцца яшчэ пяцёра. Кадравыя «прарэхі» так ці інакш закрываюцца — або дзякуючы прытоку новых сіл, або пры дапамозе пераразмеркавання вакантных ставак, сумяшчальніцтва, дадатковых урачэбных нагрузак... Інакш кажучы, лакальна, кропкава, пытанні з адсутнасцю таго ці іншага спецыяліста вырашаюцца. Але ў цэлым праблема з замацаваннем медыцынскіх кадраў у раёне, пацярпелым ад чарнобыльскай катастрофы, застаецца...

Наталля КАРПЕНКА.

Нараўлянскі раён.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАДПІСКА НА 2-Е ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	14600	43800	87600
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	13400	40200	80400
63858 (ведамасны)	24800	74400	148800
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	22200	66600	133200

Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белпошта»

Індэкс	месяц	квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	13350	40050	80100
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	12150	36450	72900
63858 (ведамасны)	22511	67533	135066
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	20140	60420	120840

Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белсаюздрук»

Індэкс	месяц	квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	13250	39750	79500
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	12120	36360	72720
63858 (ведамасны)	19591	58773	117546
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18063	54189	108378

Заставайцеся з намі!

ТУРЫЗМ: ТЭОРЫЯ НА ПРАКТЫЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Грошы я не прагуляў, не прапіў. Дзякуючы гэтаму з'явілася магчымасць пабудаваць дом. Я быў далёкім ад вясковай тэматыкі і ніколі не думаў, што ў мяне, музыканта, нешта атрымаецца. Цяпер ведаю: хочаш, каб нешта было зроблена добра, — зрабі гэта сам.

На час нашага візіту ў аграсядзібе адпачывала пара з Мурманска. Апроч таго, сюды часта прыязджаюць мінчане, масквічы, піцерцы. Летась былі турысты з Нарвегіі, Эстоніі, Латвіі, Англіі і нават з Японіі. У Аксаны і Валерыя можна спыніцца з начоўкай, паспытаць стравы беларускай кухні, схадзіць у лазню, пакатацца на конях, сплавіцца на плоце па Нёмане. Пражыванне і двухразовае харчаванне даросламу абыдзецца ў 160 тысяч рублёў у дзень. Для дзяцей прадугледжаны зніжкі.

Турпрадукт — у інфармацыйную прастору

— Мясцовым Саветам дэпутатаў разам з выканаўчымі і распарадчымі органамі варта прыняць дадатковыя меры па распрацоўцы новых падыходаў да развіцця галіны аграгурызму, — адзначыла **старшыня Мінскага аблсавета Святлана ГЕРАСІМОВІЧ**, якая ўзначальвала рабочую групу па вывучэнні гродзенскага вопыту. — Гаспадары аграсядзіб сёння не маюць працоўных кніжак, а некаторыя з іх хочуць іх мець, зарабляць сабе працоўны стаж, рабіць сацыяльны адлічэнні і г.д. Тым больш калі яны маюць магчымасць прыцягнуць да сябе на працу наёмных работнікаў. Тут неабходна распрацаваць заканадаўчую базу. Важнай задачай з'яўляецца павышэнне ўзроўню бяспекі жыцця і здароўя турыстаў, узроўню медыцынскага абслугоўвання і г.д. Не менш важным элементам паспяховага функцыянавання турыстычнага сектара з'яўляецца перавод турпрадукту ў інфармацыйную прастору. Неабходна стварэнне турысцка-інфармацыйных куткоў і тэрміналаў у кожнай гасцініцы, сістэмы анлайн-браніравання з далейшым уключэннем у адзіную інфармацыйную сетку Рэспублікі Беларусь, выданне ў дастатковай колькасці інфармацыйна-рэкламных матэрыялаў, іх размяшчэнне не толькі ў глабальным сеціве, але і на інфармацыйных стэндах, сайтах выканаўчых камітэтаў базавага і пярвічнага ўзроўняў. Пакуль што ў сельскіх Саветах няма дакладнай палітыкі па ўстанаўцы інфармацыйных знакаў пры пад'ездзе да аграсядзіб. Любы надпіс кшталту «Рады вітаць!» лічыцца рэкламнай і патрабуе ўзгаднення. У цэлым жа напрацоўкі ў Лідскім раёне ў галіне турызму выдатныя.

Інга МІНДАЛЁВА.

Лідскі раён.

«РАЗВІЦЦЁ АГРАТУРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ ПАКУЛЬ ШТО ЗНАХОДЗІЦЦА НА ПАЧАТКОВАЙ СТАДЫІ»

Пра гэта заявіў ў Лідзе Старшыня Савета Рэспублікі, старшыня Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Анатоль РУБІНАЎ.

— Мясцовыя выканаўчыя ўлады пакуль не атрымліваюць прамой эканамічнай аддачы ад гэтых аб'ектаў, — адзначыў ён.

Аднак, на яго думку, аграгурызм мае вялікі патэнцыял. Ён прываблівае замежных турыстаў, і, адпаведна, сродкі ў эканоміку Беларусі, узнімае імідж краіны.

Турызм можна разглядаць як каталізатар развіцця рэгіянальнай эканомікі. Сёння ў Беларусі працуе 1247 аграсядзіб. У 2010 годзе нашу краіну са службовымі і турыстычнымі мэтамі наведала 4 млн замежных грамадзян.

Важную ролю ў станаўленні турызму адыграў закон «Аб турызме», які ўрэгуляваў эканамічныя адносіны ў гэтай галіне, вызначыў правілы паводзін удзельнікаў турыстычнага рынку, прынцыпы дзяржаўнай палітыкі. Унясенне змяненняў і дапаўненняў у закон аб турызме дазволіла ўдасканаліць прававыя і арганізацыйныя ўмовы для развіцця экспарту паслуг.

Сёння на Лідчыне налічваецца больш за 50 аб'ектаў, якія маюць гістарычную, культурную і архітэктурную значнасць, багаты прыродны патэнцыял. Толькі ў 2010 годзе ўведзена ў эксплуатацыю 16 аб'ектаў інфраструктуры, у тым ліку гасцініцы, зоны адпачынку, аб'екты харчавання і прыдарожнага сэрвісу. У выніку колькасць замежных турыстаў, якія наведалі рэгіён, у параўнанні з 2005 годам павялічылася на 20 тысяч чалавек.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ХУТАР У «ДАЧНЫМ» ФАРМАЦЕ

Даволі значная адлегласць ад абласнога цэнтра, адсутнасць буйной прамысловасці плюс памежны статус — асаблівасцяў у Астравецкага раёна нямала. Аднак ці не галоўная асаблівасць усё ж у іншым. З 378 населеных пунктаў Астравеччыны 104 з'яўляюцца хутарамі. Менавіта гэта акалічнасць накладвае значны адбітак на жыццё ўсяго раёна.

Галоўнае — «свая зямля»

Як сцвярджаюць гісторыкі, яшчэ ў пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя на хутары прыпадала амаль чвэрць сялянскіх гаспадарак нашай краіны. Аднак неўзабаве сітуацыя рэзка змянілася. «Аднаасобнікі» ніяк не стасаваліся з маштабнымі планамі па калектывізацыі — як вынік, хутаран пачалі масава і часта прымусова перасяляць у вёскі. Але ў агульным правіле не абышлося без выключэнняў.

— У 1950—1960 гадах у нас сапраўды ліквідавалі амаль усе хутары, якія знаходзіліся непасрэдна каля Астраўца, а вось да хутароў, аддаленых ад райцэнтра, як той казаў, не дайшлі рукі, — распавядае **старшыня Астравецкага раённага Савета дэпутатаў Валерый БАРТАШЭВІЧ**. — Не сакрэт, што ніякага жадання пераязджаць у вёскі ў саміх хутаран не было. Яно і зразумела: людзі доўга збіралі грошы, будаваліся, заводзілі гаспадарку, і раптам — пачынай усё літаральна з нуля.

Асаблівы менталітэт застаўся і дагэтуль. Так, многія з маладзейшых хутаран у рэшце рэшт з'ехалі і, як правіла, з'ехалі ў гарады: у савецкія часы найбольш папулярнай была міграцыя ў Вільнюс, цяпер — у Астравец і Гродна. Аднак прадстаўнікі старэйшага пакалення працягваюць трывала трымацца за «сваю» зямлю.

— Адсюль і даволі красамоўная статыстыка, — працягвае Валерый Барташэвіч. — У нас сустракаюцца хутары, дзе жыве па дзесяць і больш чалавек. Аднак гэтая з'ява вельмі рэдкая. «Стандартны» хутар сёння мае ўсяго па 2-3 жыхары, прычым большасць хутаран — пенсіянеры. Сёй-той ужо мае сур'ёзныя праблемы са здароўем, але ўгаварыць каго-небудзь пераехаць у дом-інтэрнат вельмі складана. У крайнім выпадку яны могуць хіба што пагадзіцца пажыць некаторы час на «сацыяльных ложках» у бальніцы.

Пошта паралельна з «крамай»

Сёння практычна ўсе хутары раёна маюць электрычнасць. Аднак свая спецыфіка па-ранейшаму захоўваецца. Ні цэнтральнага водазабеспячэння, ні ацяплення, ні іншых камунальных выгод тут, зразумела, няма. А дарогі збольшага палявыя.

— На хутары не заходзяць рэйсавыя аўтобусы: каб скарыстацца імі, неабходна дабрацца да бліжэйшай вёскі — звычайна гэтая адлегласць складае два-тры кіламетры, — зазначае Валерый Барташэвіч. — А вось з гандлем праблем няма, да хутаран па графіках прыязджаюць аўтакрамы. У дадатак, некалькі гадоў таму мы аднымі з першых у краіне распачалі своеасаблівы эксперымент — па спадарожнай дастаўцы хлеба, солі і іншых тавараў першай неабходнасці адначасова з поштай. І эксперымент аказаўся ўдалым — падобная практыка сапраўды прыжылася.

З улікам паважнага ўзросту большасці хутаран, даволі актуальная тэма — медыцынскае абслугоўванне. Перш-наперш атрымаць неабходную дапамогу можна зноў жа ў ФАПах бліжэйшых вёсак. Але не толькі. Вельмі дарэчы аказалася і такая паслуга, як сацыяльнае таксі: дзякуючы яму ў пенсіянераў і інвалідаў з'явілася магчымасць паехаць у раённую бальніцу ці на абследаванне ў Гродна па невысокіх тарыфах.

— Нельга не ўзгадаць і пра сацыяльныя паслугі, — працягвае Валерый Барташэвіч. — Пры жаданні амаль кожнага можа наведваць сацыяльны работнік. У выпадку неабходнасці зрабіць дробны рамонт, пакалоць ці распілаваць дровы ў пенсіянераў і інвалідаў, што жывуць на хутарах, ёсць магчымасць звязацца з раённым тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і дамовіцца аб прыездзе мабільнай гаспадарчай брыгады. Аднак варта ўсё ж заўважыць: просяць і скардзяцца хутаране не так часта. Гэта ў аграгарадку калі-нікалі пачуеш: маўляў, вы павінны пакасіць траву, паставіць і пафарбаваць агароджу. Для большасці хутаран такая пазіцыя незразумелая і дзіўная — яны прызвычаіліся разлічваць перш-наперш на сябе.

Такое ж стаўленне і да ўласнай гаспадаркі. У большасці хутаран гады бяруць сваё, кароў на падворках становіцца ўсё менш. Аднак свінні і куры ёсць ці не ў кожнага.

— Пры гэтым хутаране актыўна здаюць лішкі сельгаспрадукцыі, асабліва яблыкі, — адзначае Валерый Барташэвіч. — А плюс да таго пераважная большасць тут мае іншую, і даволі важкую крыніцу даходаў — ад здачы нарыхтоўшчыкам лясных грыбоў і ягад.

На першым плане — адпачынак

Прэцэдэнты, калі хутаране ператвараліся ў фермераў, сапраўды былі. Праўда, апошнім часам падобных прыкладаў амаль няма. Затое ўсё часцей з'яўляюцца хутары, дзе ўжо не засталося пастаянных жыхароў. І гэта тэндэнцыя, мяркуюць у раёне, працягнецца.

— На сёння мы маем 31 фактычна «пусты» хутар, і гэта даволі аб'ектыўна, — канстатуе Валерый Барташэвіч. — Цяпер людзей перш за ўсё вабяць аграгарадкі, дзе ёсць ці не ўся звыклая для гараджан інфраструктура. Пасля працы чалавек павінен зайсці ў краму, купіць усё патрэбнае, павячэраць, памыцца і адпачыць — і з гэтым паспрачацца цяжка.

Аднак сцвярджаць, што з цягам часу ўсе хутары проста знікнуць, таксама не выпадае. Некаторыя з іх маюць усе шанцы ператварыцца ў аграсядзібы і прымаць турыстаў. Іншыя ж будуць выкарыстоўвацца як дачы.

— У нас вельмі прыгожыя мясціны — сасновы лес, грыбы-ягады, дзічына, — заўважае Валерый Барташэвіч. — А адсюль — і перспектывы. Многія пачынаюць разглядаць хутары менавіта як добрае месца для летняга адпачынку. Прычым ці не ў першую чаргу падобны варыянт выклікае цікавасць у жыхароў сталіцы.

Сяргей ГРЫБ.

Астравецкі раён.

Магілёўцаў зацікавілі фотаздымкі з розных сямейных архіваў, дзе адлюстраваны самыя розныя скульптурныя кампазіцыі. Асабліва замілаванне выклікалі касалапыя мішкі, алень з рагамі і група з трох фізкультурнікаў. У 1950-я ў Магілёве адбываліся парады піянерыі на заканчэнне навучальнага года, непадалёк ад старажытнай Ратушы (яе потым узарвалі, а цяпер аднавілі) была скульптура «Сталін і Горкі».

Вольга Паўлаўна Пімнева прадставіла вельмі цікавы экспанат: прафсаюзны білет, аказваецца, запаўняўся ў 1927 годзе на чатырох мовах — рускай, беларускай, польскай і ідышы. Яшчэ адзін дакумент — фотаздымак для пасведчання 1919 года, зроблены для непісьменнага дравакла да Іосіфа Ганчарова. Высветлілася, што дравакладчык працаваў на чыгунцы, якая за тым часам працавала на дровах.

Кранальныя фота выпускніцкой школы 1941 года — усе маладыя і жывыя. Яўрэйскія дзяўчыны на вуліцах горада ў 1930-я гады. Жанчына, якую назвалі Беларусь: праўда, у сям'і яе звалі проста Ляляй. Тройчы Герой Савецкага Саюза Іван Кажадуб у 1966 годзе фатаграфаваўся на прыступках гасцініцы «Дняпроўская», а сёння яе ўжо не існуе. Пасведчанне аб шлюбе пісалі сто гадоў таму ад рукі. Становішча да шлюбу вызначана наступным чынам: ён — ласты, яна — дзяўчына.

Цікавыя вясельныя здымкі: да рэвалюцыі (адну копію фота, зроб-

Фотография на удостоверение личности «Личность неграмотного дровокладa Иосифа Лаврентьевича Гончарова удостоверяю» 25.02.1919

Непісьменны дравакладчык.

Сяброўская кніжка № 52734
Заполнялась на четырех языках:
русском, белорусском, польском и иврите. 1927 год

Паслярэвалюцыйнае чатырохмоўе.

ленага ў атэлье Фішмана, даслалі нават з Ізраіля) маладая была ў белым строі «ў падлогу» з высокім каўнерыкам. У пасляваенныя гады, згодна з тагачаснай модай, нявеста апранала сукенку ў дробныя кветачкі і какошнік, а вось вэлюм быў і застаецца актуальны ва ўсе часіны.

— Зазірніце ў свае сямейныя альбомы, убачыце там шмат цікавых рэчаў, — раіць арганізатар выставы, загадчыца чытальнай залы цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Карла Маркса Алена Кандраценка. — Выявілася, што ў магілёўцаў ёсць сапраўдныя рарытэты, якія расказваюць пра цікавыя факты з жыцця нашага роднага горада. Дакрануцца да гісторыі нам дапамагаюць не сухія факты, а людзі і іх лёсы.

Падаецца, што сімвалам гэтай выставы, якая аб'яднала мінулае горада і яго сучасных жыхароў, стала фота Мікалая Ножнікава. Модны падлетак у ролікавых каньках стаіць на прыступках дома з датай «1910 год», а на вельмі старых дзвярах цяпер ужо звыклае графіці «Rap». Rap і 1910. Часіны мяняюцца. Мода мяняецца. Магілёў і магілёўцы застаюцца.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Шчасце, калі ў доме Гаспадар

ПТУШЫНЫ ДВОР ШОШЫНЫХ, альбо «Я, як і мае фазаны, не люблю спёку»

Карэспандэнт «Звязды» наведала сям'ю, у якой куратнік большы, чым дом

Першых курэй Сяргей і Валянціна завялі 12 гадоў таму. Гэта былі самыя звычайныя нясушкі. Далей — болей. Зараз на падворку Шошыных, акрамя індыкоў, гусей, вутак ды перапёлак, можна ўбачыць яшчэ і 41 пароду дэкаратыўных курэй, 10 парод фазанаў і 3 разнавіднасці паўлінаў...

«Суседзі думалі, што мы тут катоў разводзім»

У адказ на пытанне, колькі ўсяго птушак у гаспадарцы, Сяргей Шошын толькі паціскае плячыма.

— Можа, 150... Ці 200... Дакладна не скажу, бо мяне гэта пытанне мала цікавіць. Я ж не камерсант. Трымаю птушак перш за ўсё для душы. Калі атрымліваецца развесці рэдкі від, гэта такое шчасце!

Першыя куры з'явіліся на лецішчы сям'і Шошыных у канцы 90-х. Набывалі іх, прызналіся, выключна дзеля яек. Самі ж працягвалі жыць у Мінску і як мінімум раз на тыдзень ездзілі ў Студзёнку, каб праведаць сваіх гадаванцаў. Ішоў час. Неўзабаве і ў дворыку гарадскога дома на дзіва суседзям з'явіліся невялічкія вальеры. Праўда, насялялі іх не звычайныя, а дэкаратыўныя нясушкі.

— Колькасць птушак, якіх я прывозіў з Украіны, Расіі, Польшчы, Чэхіі, як на лецішчы, так і побач з домам у Мінску, расла, — распавядае птушкавод. — Пастаянныя паездкі ў вёску і назад аднімалі шмат сіл. Таму мы параіліся з Валюшай — і вырашылі пераехаць жыць у Студзёнку.

Сяргей уладкаваўся працаваць у прыватную фірму зваршчыкам. Догляд жа птушак у асноўным лёг на плечы Валянціны.

— У красавіку быў год, як я дзеля птушак звольнілася з працы. Знаёмыя ў горадзе доўга мяне адгаворвалі. Маўляў, адумайся, пакуль не позна. Але калі раней я сумнявалася, то цяпер магу з упэўненасцю сказаць, што аб сваім рашэнні не шкадую. Мне падабаецца жыць у вёсцы. Тут адчуваю сябе свабоднай. Займаюся агародам, вырошчваю кветкі, ды і куры, у адрозненне ад начальства, сварыцца не ўмеюць *(смяецца)*. Не магу сказаць, што я нешчаслівая. Муж у мяне добры: не п'е, не курыць, дзяцей любіць, ды і я ўвагай не абдзеленая. І рукі ў нашага таткі залатыя. Усе, хто ні прыязджае да нас у Студзёнку, дзіву даюцца. «Ну і ну, кажуць, у вас куратнік у два разы большы, чым дом».

Сяргей пацвердзіў, што ўсё, што ёсць на лецішчы, у тым ліку і вальеры для птушак, пабудаваў уласнымі рукамі. У бліжэйшых планах — змайстраваць новы куратнік, дзе кожная парода птушак мела б асобнае месца для выгулу.

— Наймаць нейкую будаўнічую арганізацыю — для мяне дарагое задавальненне, — кажа суразмоўца. — Калі б трэба было плаціць некаму за працу, то наогул бы нічога не пабудаваў. Дарэчы, вам пашанцавала: прыехалі б днём, калі сонца паліла, то наўрад ці ўбачылі б фазанаў. Яны цярпець не могуць прамых сонечных прамянёў, таму хаваюцца ў дамкі. Шчыра прызнацца, я, як і мае фазаны, таксама не люблю спёку. А вунь, гляньце, паўлін хвост раскрыў, пэўна, для вас *(усміхаецца)*. Дарэчы, чуеце, як яны вітаюцца?...

— Такое адчуванне, што гэта не паўлін, а «марцовыя» каты мяўкаюць, — шчыра здзіўляюся.

— Суседзі ўжо прызвычаіліся. А спачатку, калі мы толькі іх прывезлі, думалі, што мы катоў тут разводзім *(смяецца)*.

«Раніцай выпівайце шэсць перапяліных яек, і будзеце цудоўна выглядаць»

Пакуль я спрабавала сфатаграфаваць паўлінаў ва ўсёй красе (а зрабіць гэта няпроста: гэтая птушка, калі бачыць чужога чалавека, складае свой шыкоўны хвост), Валянціна расказала, як яны па нявопытнасці ўпусцілі дзвюх птушак.

— Было гэта мінулай восенню, бульбу капалі, як зараз памятаю. Вырашылі мы перагнаць паўліна ў новы вальер. Думалі, гэта курачка, а ён як убачыў, што над галавой няма перашкоды, адразу ж узняўся ў неба. Мы тады абхадзілі ўсю вёску ўздоўж і ўпоперак. Вельмі моцна перажывалі. Але таго паўліна мы так больш і не пабачылі. А вось фазаніха паляцела некалькі дзён і вярнулася назад. Села на дах, быццам бы нічога і не было. Доўга мы бегалі за ёй з сачком вакол дома. А калі ў рэшце рэшт злавілі, столькі радасці было!

— Гэты певень, у якога грабеньчык нагадвае рогі, пароды султанка, — працягвае знаёміць са сваімі гадаванцамі гаспадар. — А побач, бачыце, сядзяць мараны медна-чорныя. Куры гэтай пароды нясуць вось такія (паказвае) карычнева-чырвоныя яйкі, іх яшчэ называюць «велікодныя», бо фарбаваць не трэба. А вось тут у нас жывуць перапёлкі. Гэта птушка, у адрозненне ад курэй, не хварэе. І нядзіўна, бо пры такой высокай тэмпературы цела (42 градусы) ніякая зараза — ні сальманэлы, ні стафілакокі — не выжыве.

«Людзі, якія набываюць у нас куранят ці яйкі, кажуць, што нават у заапарку не бачылі столькі птушак. Пытаюцца дазволу наступным разам прыехаць на экскурсію ўсёй сям'ёй. Вось пасля такой чарговай просьбы ў мяне і нарадзілася ідэя стварыць парк птушак».

Трымаюць Шошыны перапёлак выключна для сябе. З-за яек, якія, як вядома, змяшчаюць нашмат больш карысных пажыўных рэчываў, чым курыныя. Сяргей сцвярджае, што дастаткова шторанішу выпіваць па шэсць штук, і цудоўны выгляд забяспечаны. Маўляў, далёка за прыкладам хадзіць не трэба (паказвае на «сваю Валюшу»). Ды і перапялінае мяса, дадае, нічым не саступае дзічыне, нездарма на Русі стравы з перапёлак лічыліся выключна царскай ежай.

«Людзі крыўдзяцца, што я не ўсім прадаю куранят»

Многія птушкаводы, даводзілася чуць, не надта ахвотна паказваюць сваіх улюбёнцаў. Баяцца, каб не сурочылі. Шошыны ж, наадварот, заўсёды рады гасцям. Больш за тое, Сяргей прызнаўся, што марыць стварыць у Беларусі сапраўдны парк птушак.

— Людзі, якія набываюць у нас куранят ці яйкі, кажуць, што нават у заапарку не бачылі столькі птушак. Пытаюцца дазволу наступным разам прыехаць на экскурсію ўсёй сям'ёй. Вось пасля такой чарговай просьбы ў мяне і нарадзілася ідэя стварыць парк птушак.

Да восені Сяргей плануе папоўніць сваю калекцыю як мінімум на 10 парод. Сярод новых гадаванцаў абавязкова будзе рэдкая разнавіднасць паўлінаў — белы. Акрамя таго, будзе спрабаваць атрымаць дазвол на развядзенне дзікай птушкі.

— Дарэчы, жонка маю ідэю стварыць парк птушак спачатку не вітала. Але пасля выставы пародзістай птушкі «АграФэст-2011», у якой мы таксама прымалі ўдзел, змяніла сваю думку. І нядзіўна, бо людзі падыходзілі і казалі: «Дзякуй, што паказалі іх нам, а то мы жылі і не ведалі, што такія птушкі бываюць». Кожны другі пытаўся: «А што, яны яшчэ і нясуцца? І іх яйкі можна есці?»

Зарабляць на птушках, прызнаўся гаспадар, пакуль не надта атрымліваецца. Ды ён да гэтага асабліва не імкнецца.

— У асноўным усе грошы, што маем ад продажу інкубацыйных яек і птушанят, ідуць на іх корм. Калі і выпадаюць нейкія лішкі, адразу ж набываю новыя пароды птушак. А гэта, паверце, не таннае задавальненне. Адно яйка курэй пароды англійскі мадэрн, напрыклад, я набыў у Маскве ў пераліку на нашы грошы за 30 тысяч рублёў. А трэба ж з іх яшчэ куранят вывесці, а пасля іх выгадаваць. Людзі пра гэта не ведаюць, таму і здзіўляюцца, чаму ў мяне такія высокія, на іх погляд, цэны.

Сяргей прызнаўся, што, нягледзячы на вялікую колькасць незадаволеных, прадаваць сваіх гадаванцаў кожнаму спадарожнаму не стане. Бо на ўласным вопыце пераканаўся, што не ўсе пакупнікі гатовы несці адказнасць за іх здароўе.

— Заводзяць, а як утрымліваць ды чым карміць — слухаюць напаўвуха. Альбо набываюць яйкі, а як выводзіць куранят у інкубатары не ведаюць. Пасля тэлефануюць і прад'яўляюць прэтэнзіі. Лічаць, што я вырашыў на іх нажыцца. Я ж займаюся птушкай не дзеля грошай, як многія думаюць. Таму рынцыпова прадаю толькі тады, калі ўпэўнены, што людзі змогуць паклапаціцца пра куранят.

«Каб атрымаць зямлю, стаў беларусам»

Падчас размовы высветлілася, што як Сяргей, так і Валянціна родам з Расіі. У Беларусь на пастаяннае месца жыхарства прыехалі разам з дзецьмі ў 1996 годзе.

— Я сам нарадзіўся ў сяле Тарханы Пензенскай вобласці. У 72-м годзе пераехалі з бацькамі на Урал. А ў 95-м вырашыў паказаць дзецям сваю радзіму: прайшліся па вёсцы, наведалі музей-маёнтак Лермантава. Перад ад'ездам вырашылі заехаць да траюраднай сястры. Там, так супала, якраз гасцюй яе знаёмы з Мінска. Беларус, калі ўбачыў маю іншамарку, пацікавіўся, колькі я за яе аддаў. «Пяць тысяч», кажу. «Прыязджай да нас, у Мінску такія тры каштуюць», пачуў у адказ.

У сакавіку Сяргей і сапраўды завітаў у Беларусь па машыну. А праз некалькі месяцаў пераехаў у Мінск на пастаяннае месца жыхарства разам жонкай і дзецьмі.

— Больш як пяць гадоў таму перавезлі сюды і маіх бацькоў. Маці і цяпер жыве побач з намі ў Студзёнцы. Бацькі летась не стала. Матуля сцвярджае, што калі б засталіся ў Расіі, памёр бы значна раней. Хварэў тата. Тут жа я яго вазіў на лячэнне ў Бараўляны. Маці вельмі рада, што жыве ў Беларусі. Кажа, што хоць пажылі, па-людску, на старасці гадоў. Яблыкаў паелі ўволю, бо там, на Урале, такой магчымасці не было.

У Шошыных побач з домам не толькі вялікі сад, але і шмат кветак. Не так даўно пасадзілі некалькі туй, каб, калі вырастуць, ствараліфазанам цень. За вальерамі сотак 70 апрацаванай зямлі. Яшчэ не так даўно, паводле слоў Сяргея, тут было пустазелле.

— Папрасіў у мясцовых чыноўнікаў дазволу акультурыць гэты ўчастак. У адказ пачуў, што на мяне гэтую зямлю ніхто не аформіць, бо я грамадзянін Расійскай Федэрацыі. Вось так, дзеля зямлі, я і стаў беларусам. Літаральна ў лютым атрымаў беларускае грамадзянства.

Наваспечанаму беларусу адразу ж выдзелілі ўчастак памерам з гектар. Маўляў, больш не паложана. Афармляць жа фермерскую гаспадарку птушкавод пакуль не бачыць сэнсу. Бо, не сакрэт, што фермерам выдзяляюць не самыя лепшыя землі.

— Не надта проста ў Беларусі разводзіць птушку, — рэзюмаваў Сяргей Шошын. — Праблема тут з ветэрынарамі, якія спецыялізаваліся б на птушках. Ды і даведку атрымаць, каб завесці сваіх гадаванцаў на конкурс у тую ж самую Расію, як высветлілася, практычна нерэальна. Акрамя таго, камбікорму курынага зімой у Беларусі не набыць, бо завод яго не вырабляе. Пэўна, лічаць, што нас не існуе, што ён нікому не патрэбны. Даводзіцца прасіць знаёмых, каб прывозілі з Масквы.

Дарэчы, як сцвярджае Сяргей, без добрых людзей і сёння б, хутчэй за ўсё, пуставаліяго соткі.

— Ведалі б, колькі я дабіваўся, каб мне мясцовы калгас дапамог пасеяць збожжа. І гэта пры тым, што не бясплатна прасіў, гатовы быў заплаціць столькі, колькі скажуць. І толькі, як я пасля даведаўся ад мясцовых жыхароў, дзякуючы Таццяне Іванаўне мне пайшлі насустрач. Гэтая жанчына, як і мы, «заразілася» птушкай, працуе ў гаспадарцы запраўшчыцай. Яна замовіла за мяне слова — цэнны, відаць, работнік, раз прыслухаўся старшыня, — і мне выдзелілі сучасны трактар. Калі б не яна, не выключаю, што і дагэтуль бы аббіваў парогі. Адным словам, перашкод хапае. Даводзіцца разлічваць толькі на свае сілы ды на знаёмых, якія дапамогуць словам альбо справай. Сумна гэта ўсё, але хочацца верыць, што нешта зменіцца да лепшага.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.
Смалявіцкі раён.

МЯДОЦКІЯ ЧЫТАННІ

«Берагіня» чытае, спявае, танчыць

Беларускай традыцыйнай культуры і дзецям былі прысвечаны VI рэспубліканскія Мядоцкія чытанні, якія гэтымі днямі прайшлі ў Барысаве. Удзельнікі чытанняў прааналізавалі ролю асобы ў народнай культуры і педагогіцы. Галоўным «стрыжнем» мерапрыемства стаў праект «Мы — Берагіня» з нагоды 15-годдзя ўзорнага фальклорнага гурта «Берагіня».

Заснавальнік «Берагіні», яе нязменны мастацкі кіраўнік этнахарэограф Мікола Козенка з самымі сталымі гасцямі фэсту — удзельнікамі фальклорнага гурта «Мядоцкая талака» Мётчанскага СДК.

Даша Бярозка і Даша Абрамовіч былі вядучымі на заключнай святочна-юбілейнай імпрэзе. Фотааб'ектыў убачыў школьніц побач з лялькамі, якіх дзеці зрабілі і апранулі ў мясцовыя строі.

Янка Навіцкая — адна з маленькіх салістак узорнага фальклорнага гурта «Берагіня».

Барысаўскім школьнікам было што паказаць гасцям. У беларускамоўнай гімназіі № 2 створаны выдатны музей гісторыі і культуры раёна (кіраўнік музея — выкладчык студыі этнаграфіі і фальклору Аляксандр Яшчанка). Ёсць у гімназіі і выстава твораў жывапісу, саломапляцення.

Ад 1996 года адлічвае сваю гісторыю гэты творчы калектыў комплексу дзіцячы сад-сярэдняя школа вёскі Новая Мётча Барысаўскага раёна. З першых дзён па сёння галоўным напрамкам «Берагіні» з'яўляецца вывучэнне традыцыйнай танцавальнай і музычнай культуры свайго краю, яго народнай прозы, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вывучаць, зберагаць, распаўсюджваць гэту спадчыну — творчае крэда «Берагіні».

Сёлета VI рэспубліканскія Мядоцкія чытанні праводзіліся на базе барысаўскай беларускамоўнай гімназіі № 2, і гэта вельмі дарэчы, бо гарадскія дзеці больш за іншых адчуваюць недахоп станоўчага ўздзеяння традыцыйнай народнай культуры. Як захаваць каштоўныя ўзоры гэтай культуры, выкарыстаць яе спадчыннае багацце ў справе выхавання асобы — пра гэта разважалі і дзяліліся вопытам навукоўцы, педагогі, дзеячы мастацтва. Разам з вядомымі знаўцамі на секцыйных занятках выступалі школьнікі — гэта яны за мінулыя гады сабралі ў роднай вёсцы багаты куфэрак старажытных спеваў, танцаў, паданняў, перанялі ад старэйшых майстэрства вышывання, пляцення паясоў. На заключнай святочна-юбілейнай імпрэзе дзятва са школы вёскі Новая Мётча выступіла не менш эфектна, чым паважаныя госці са сталіцы — ансамбль беларускай музыкі «Талака» кафедры этналогіі і фальклору Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў.

Гурт «Берагіня» прывёз на сустрэчу з гарадскімі гледачамі не толькі песні і танцы: у фае гімназіі была разгорнута вялікая фотавыстава, якая распавядала пра людзей і побыт вёскі, пра далёкія замежныя паездкі дзятвы. Дарэчы, пра адну з такіх паездак у Парыж тут расказвалі самі яе ўдзельнікі — былыя мётчанскія школьнікі. Выпускнікі мінулых гадоў былі на гэтых чытаннях адначасова і жаданымі гасцямі, і вельмі дасведчанымі ўдзельнікамі. На іх прыкладзе можна было ўбачыць, як усвядомленая з дзяцінства павага да народнай спадчыны становіцца потым неад'емнай рысай характару грамадзяніна.

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры, музычны кіраўнік узорнага фальклорнага гурта «Берагіня» Антаніна Абрамовіч вельмі яскрава перадала жыццядайны патэнцыял народнага мастацтва ў адным з напісаных ёю вершаў:

На роднай зямельцы
нішто не часова:
Ні яснае сонца, ні снег на мяжы.
Мая «Берагіня», ратуй мяне словам
І спадчыннай песняй мяне беражы.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.

Крымінал, здарэнні

ВЕЦЕР АБРЫНУЎ НАВЕС НА ЧАЛАВЕКА

Згодна з аператыўнай інфармацыяй МНС, з-за моцных парываў ветру (да 25 м/с) у панядзелак пацярпелі шэсць населеных пунктаў у Мінскай і Магілёўскай абласцях. Былі пашкоджаны дахі сямі жылых дамоў, чатырох сельскагаспадарчых будынкаў.

Па звестках ДВА «Белэнерга», на тэрыторыі краіны былі абясточаны 474 населеныя пункты, 57 сельскагаспадарчых будынкаў, 1195 трансфарматарных падстанцый. Электразабеспячэнне ўсіх спажыўцоў адноўлена.

У Маладзечне на плошчы Старое Месца з-за парыву ветру абрынуўся навес прыпыначнага пункту грамадскага транспарту, у выніку чаго пацярпеў адзін грамадзянін. Ён быў шпіталізаваны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАР'ЕРНЫ ФІНАЛ

Пры перагоне свідравальнага станка на іншае месца, яго машыніст, які працаваў у кар'еры «Сялянская Ніва» друзавага завода «Глушкевічы», што ў Лельчыцкім раёне, не адключыў электрычнае сілкаванне ад трансфарматарнай падстанцыі.

Пры гэтым рабочы пачаў здымаць ізаляцыю з жылы кабеля, які сілкуе гэты станок. У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС паведамілі, што мужчына атрымаў электратраўму са смяротным зыходам.

КАХАННЕ ДА... ТРУНЫ

Былую жонку забіў нажом 52-гадовы жыхар Калінкавіцкага раёна.

Раніцай ён нанёс жанчыне, з якой пасварыўся, некалькі раненняў, пасля чаго знік з месца злачынства. Міліцыянеры адшукалі грамадзяніна ў лесе побач з вёскай Дудзічы. Пры затрыманні ён нажом параніў сабе шыю і трапіў у рэанімацыю. А вось у Рэчыцы ў бальніцу быў дастаўлены 38-гадовы мужчына. Яму ўваткнула нож у жывот жонка. Разборка адбылася ноччу пасля сумеснага распіцця спіртных напояў. У прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама паведамілі і пра тое, што жыхарка Рагачова ў стане непрытомнасці і з цяжкімі траўмамі галавы была знойдзена на беразе ракі Друць. Жанчыну збіў рукамі і нагамі мужчына, раней судзімы, з якім яна да гэтага інцыдэнту прымала спіртныя напоі на прыродзе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КВАТЭРЫ РАМАНТАВАЛІ «ХАЛТУРШЧЫКІ»

У Віцебскай вобласці супрацоўнікі падатковых органаў сёлета толькі за першыя чатыры месяцы ўстанавілі 65 фактаў аказання паслуг па рамонце кватэр без адпаведнай дзяржаўнай рэгістрацыі.

Дарэчы, ці ведаюць такія руплівыя майстры, што за незарэгістраваную прадпрымальніцкую дзейнасць прадугледжаны штраф у памеры да ста базавых велічынь? Могуць канфіскаваць усе інструменты. Ды і даходу можна лёгка пазбавіцца.

Дарэчы, усяго ў выніку праверак з ценявога абароту канфіскавалі тавару і незаконна атрыманага даходу ў розных сферах дзейнасці больш за 270 мільёнаў рублёў — па ўсіх 430 фактах незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. А яшчэ дадаткова налічылі адзіны падатак у суме больш за 20 мільёнаў рублёў. Агульная сума накладзеных штрафаў пацягнула на 35 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Рэха публікацыі

«УЛАДЫ ГАТОВЫЯ ІСЦІ НА ДЫЯЛОГ, АЛЕ АХВОТНЫХ АДКАЗВАЦЬ ЗА САД НЯМА...»

У нумары нашай газеты ад 12 мая мы спрабавалі разабрацца ў канфлікце паміж 53 жыхарамі аграгарадка Галоўчын Бялыніцкага раёна (менавіта столькі людзей на той момант падпісала калектыўную скаргу) і мясцовымі ўладамі. Ён узнік з-за таго, што апошнімі было прынятае рашэнне па высечцы старога саду, фактычным гаспадаром якога быў СВК «Кудзін». Заяўнікі, не звяртаючы ніякай ўвагі на апошнюю акалічнасць (уласнік па сваім разуменні можа распараджацца дабром, тым больш што сад яшчэ ў 2009 годзе быў спісаны з балансу гаспадаркі), даводзілі, што сад хоць і стары, але пладаносіць. Вяскоўцы прызвычаіліся тут выгульваць і кароў, і коней. Слабым, на думку месцічаў, аргументам на карысць высечкі саду была і заява пра тое, што менавіта тут, сярод старых дрэў, знаходзіўся вялікі ачаг баршчэўніку Сасноўскага. Адным з дзейсных спосабаў барацьбы з гэтай раслінай з'яўляецца ўзворванне. А для яго перашкодай, натуральна, служаць дрэвы...

Мясцовыя ўлады, нагадаем, прапаноўвалі насельніцтву, якое так горача выступала супраць знішчэння саду, альтэрнатыўны, скажам так, варыянт яго захавання. Любы ахвотны, чый участак прымыкае да саду, напісаўшы заяву, мог узяць патрэбную плошчу з дрэвамі ў карыстанне. Пры гэтым несці поўную адказнасць за падтрыманне на тэрыторыі ў вызначаных для ахвотнікаў межах парадку (сад быў моцна засмечаны бытавымі і будаўнічымі адходамі), а таксама за барацьбу са згаданым баршчэўнікам Сасноўскага. Землеўпарадкавальная служба зрабіла падварвабы абход з гэтай прапановай, аднак іводны насельнік не пажадаў напісаць такую заяву... Улічваючы колькасць незадаволеных высечкай саду грамадзян, у мінулы раз мы дамовіліся з **першым намеснікам старшыні Бялыніцкага райвыканкама Леанідам ЗАСЕМЧУКОМ** праз нейкі час вярнуцца да гэтай жа тэмы. Магчыма, і месцічам, і ўладам удалося знайсці нейкі кампраміс у справе?

— Дагэтуль іводны жыхар прылеглых да саду вуліц не напісаў заявы аб выдзяленні яму ў карыстанне пэўнай плошчы з дрэвамі. Хоць гэтая прапанова застаецца ў сіле — улада гатовая ісці на дыялог. Вядома, калі чалавек возьме кавалак саду, які прылягае да яго падворка, а не стане, умоўна кажучы, паказваць пальцам, што хоча ўзяць у карыстанне трэцяе, сёмае і дванаццатае дрэвы. Натуральна, як ужо гаварылася раней, на атрыманай тэрыторыі вясковец потым будзе абавязаны падтрымліваць чысціню і парадак, весці барацьбу з баршчэўнікам, — паведаміў на наш запыт Леанід Іванавіч. — Паўтаруся, ахвотных пакуль не знайшлося, хоць людзі пратэстуюць супраць высечкі дрэў. Аднак пакрысе гэтая справа будзе зроблена — знікне дзве трэці саду. Праўда, з-за спрэчак час сёлета быў згублены: сад зацвіў, пусціў новыя парасткі. Таму з прыцягнутых да высечкі саду чатырох арганізацый штодня працуе ад адной да трох. Працэс ідзе павольна. Хоць мушу нагадаць пра існаванне дзяржаўнай праграмы пладаводства, якая прадугледжвае раскарчоўку старых садоў. І не толькі ў нашым раёне, а па ўсёй краіне. Скажам, давялося пагутарыць на гэтую ж тэму з калегам з Магілёўскага раёна, ды і тэлесюжэт пабачыць адтуль. Дык вось, за апошні час толькі ў адным гэтым раёне было высечана 280 гектараў старых садоў. І кожны гектар, як прызнаўся калега, даваўся, зноў жа ўмоўна кажучы, потам і крывёй — з-за спрэчак, калектыўных скаргаў, пратэстаў насельніцтва...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЦЭНЫ ЗАШКАЛЬВАЮЦЬ, БО ГЭТА КАМУСЬЦІ ВЫГАДНА?

Суб'ектыў

На такі роздум наводзіць наведванне ў Мінску Цэнтральнага рынку будаўнічых матэрыялаў, што ў мікрараёне Уручча. Дакладней, выпадкова ўбачаная там характэрная для нашых дзён сцэнка. Сталы мужчына, відаць, дачнік-пенсіянер, ветліва пытаецца ў маладога прадаўца матэрыялаў для даху: колькі каштуе адзін ліст андуліна? А калі пачуў у адказ: «123 тысячы за ліст», то літаральна аслупянеў, а праз хвіліну з абурэннем выдыхнуў: «Няхай яны задушацца такімі цэнамі». І пайшоў далей.

Хто не ведае, нагадаем: андулін уяўляе сабой бітумны хвалісты дахавы ліст, які ў нас чамусьці называюць еўрашыферам. Да нас ён спачатку завозіўся з Францыі, а потым з Польшчы. Гэта каляровы, лёгкі, трывалы і надзейны нават у нашых кліматычных умовах шыфер новага пакалення. Да нядаўняга часу ён быў адносна эканамічным матэрыялам для пакрыцця дахаў жылых і гаспадарчых будынкаў. У Беларусі андулін набыў папулярнасць. Восенню яго ліст каштаваў 30-33 тысячы ў залежнасці ад колькасці набытых штук. Яшчэ тры тыдні назад ліст андуліну можна было набыць за 38-43 тысячы. Таксама нямала ў параўнанні з леташнімі цэнамі, але ўсё ж даступна. Але цяпер яго цана так скокнула ўгору, што выклікае і здзіўленне, і сумненне ў аб'ектыўнасці яе фарміравання. Я прайшоўся па рынку, і ў кожнага гандляра была свая цана: ад 102 да 127 тысяч рублёў за ліст. У доларавым эквіваленце яна вагалася ад 15 да 23 у. а. Чаму? У кожнага свой уласны курс долара?

Гандляры гэты роскід цэн абгрунтоўваюць цяжкасцю набываць валюту на нявэўным курсе, пераплачваць «чорным» валютчыкам і нават даваць хабар супрацоўнікам банкам, каб тыя прадалі долары па афіцыйным курсе. Але думаецца, гэта ўсё ў асноўным адгаворкі для наіўных спажыўцоў, каб тыя паверылі ў аб'ектыўнасць «куслівых» цэн. Склалася ўражанне, што прыватным гандлярам не вельмі хочацца, каб курс долара стабілізаваўся на ўзроўні 5-6 тысяч, і ён, нарэшце, свабодна з'явіўся ў абменных пунктах, а гандлёвыя аперацыі з імпартным таварам вярнуліся ў ранейшае рэчышча. А вось долар на ўзроўні 9-10 тысяч, таварная ліхаманка, няўпэўненасць у заўтрашніх цэнах, думаецца, дазваляе няблага зарабляць пастаўшчыкам імпарту.

Уражвае і тое, як аднадушна і рэзка ўзняліся цэны і на тавары беларускай вытворчасці. Гандляры Цэнтральнага рынку будаўнічых матэрыялаў тут у ліку лідараў. Скажам, міжвянцовы ўцяпляльнік для драўляных зрубаў шырынёй 20 см і даўжынёй 20 метраў вытворчасці Аршанскага льнокамбіната ў прыватным магазіне пад Мінскам у вёсцы Каралёў Стан, што па Маскоўскай шашы, каштуе 12 700 рублёў. А на базары ва Уруччы — 25 тысяч. І такіх прыкладаў сотні, калі не тысячы. Не спяць у шапку нашы мацёрыя спекулянты, прабачце, бізнэсмены. Дзяруць шкуру з пакупніка штучна завышанымі цэнамі. Як гэтаму супрацьстаяць? Намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур днямі супакоіў народ: урад зараз выпрацоўвае пакет мер па ліквідацыі дыспарытэту цэн, будзе ўзмоцнена ўвага да прычын узнікнення спекулятыўных цэн, актывізуецца маніторынг на месцах, будуць вывучаны выпадкі змоў аптовых пастаўшчыкоў і г. д. Хутчэй бы.

Як паведамлялася, сітуацыю на спажывецкім і валютным рынках краіны 3 чэрвеня разгледзіць Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях. Хацелася, каб Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі не абмежавалася аднымі толькі дэкларацыямі і заклікамі, а выкарыстала ўвесь арсенал спосабаў і метадаў уздзеяння прафесійных саюзаў для паляпшэння жыцця працоўных. Мяркуецца, што на пасяджэнні Нацыянальнага савета будуць разгледжаны перспектыўныя планы ўрада па стабілізацыі эканомікі, захаванні працоўных месцаў і прыбыткаў грамадзян. Можна дадаць яшчэ адзін пункт у парадак дня савета: нагадаць нашаму гандлёваму бізнэсу, што яго сацыяльная адказнасць перад насельніцтвам — гэта не пустыя словы.

А што рабіць звычайнаму чалавеку, які трапіў сёння ў складаную сітуацыю? Я, напрыклад, для сябе вырашыў: да верасня нічога не купляць істотнага, акрамя самага неабходнага. А там паглядзім. Бо пераплачваць спекулянтам не вельмі хочацца.

Леанід ТУГАРЫН.

Вяртаючыся да надрукаванага

З 29 ІСКАЎ НА КАРЫСЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВА ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ ГРАМАДЗЯН ПА ВЫВАЗЕ БЫТАВОГА СМЕЦЦЯ ПРЫЗНАНАЯ ПА 16-ЦІ

У нумары «Звязды» ад 10 сакавіка пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў змешчаны матэрыял «Тарыф на вываз смецця ці на нашу свядомасць?» Гаворка ў ім ішла пра канфлікт прыкладна каля 50 насельнікаў вёскі Хатынічы Ганцавіцкага раёна з камунальным унітарным міжгаліновым вытворчым прадпрыемствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Ганцавіцкая жыллёва-камунальная гаспадарка». Пра канфлікт настолькі сур'ёзны, што, прынамсі ў дачыненні гэтай названай паўсотні вяскоўцаў, прадпрыемства на момант нашага разбору ў сітуацыі або ўжо падрыхтавала позвы ў суд, або рыхтавалася зрабіць гэта бліжэйшым часам. І ўсё — фактычна з-за бытавога смецця. Дакладней, з-за таго, як заключаліся дагаворы паміж грамадзянамі і вышэйназваным прадпрыемствам на вываз яго з падворкаў вяскоўцаў.

Коратка нагадаем сутнасць праблемы. У 2006 годзе было прынятае заканадаўства, якое рэгламентавала пытанні ўтылізацыі бытавых адходаў ад насельніцтва. Была пастаўленая задача ахапіць абавязковай паслугай па вывазе бытавога смецця 100 працэнтаў вяскоўцаў. У адпаведнасці ўжо з рашэннем мясцовых уладаў у 2006-2007 гадах бланкі на аказанне паслуг перадаваліся ў сельскія Саветы — для заключэння дагавораў паміж грамадзянамі і прадпрыемствам «Ганцавіцкая жыллёва-камунальная гаспадарка». Аказанне саміх паслуг пачалося фактычна з красавіка 2008 года. На момант звароту ў газету вяскоўцаў, тарыф за вываз смецця складаў 600 рублёў у месяц з чалавека. Пагадзіцеся, гэта цалкам прымальныя грошы для бюджэту любой сям'і. Хоць, нагадаем, некаторыя з заяўнікаў спрабавалі пераканаць нас, што гэтая плата б'е па кішэні, больш за тое — смецця ў іх няма. У тым сэнсе, што яны пазбаўляюцца ад яго самастойна: нешта паляць у печы, штосьці закопваюць на ўчастках. Але, па-першае, ці цывілізаваны такі падыход? Па-другое, пры сучасным жыцці ну ніяк не абысціся без пластыкі, поліэтылену, шкла — рана ці позна, у большай ці меншай колькасці, але такія адходы ўсё роўна з'явяцца ў кожнай сям'і. А іх жа і не спаліш, і не закапаеш на агародзе. Дык як вяскоўцы думалі ад іх пазбаўляцца?..

Аднак галоўная праблема, думаецца, была як раз у форме заключэння дагавораў на аказанне паслугі па вывазе смецця паміж насельніцтвам і прадпрыемствам — праз сельскі Савет. Бо заяўнікі якраз і скардзіліся, што нічога не падпісвалі, а ім павыстаўлялі рахункі. На якой падставе? Прадстаўнік прадпрыемства «Ганцавіцкая жыллёва-камунальная гаспадарка» ў мінулы раз агучыў такую версію на гэты конт. Сказаў, што калі ў сям'і некалькі чалавек, нехта з сямейнікаў мог па нейкіх іншых справах наведаць той сельскі Савет, а заадно і падпісаць дагавор на вываз смецця. Падпісаць і забыцца, нічога не сказаць іншым членам сям'і. Такая заўвага выглядае не пазбаўленай сэнсу і мае права на існаванне. Толькі ці магло так аднолькава паступіць адразу столькі людзей? Нейкі калектыўны прыступ амнезіі атрымліваецца...

Як бы там ні было, аднак менавіта суд і быў прызваны расставіць усе кропкі над «і» ў гэтай заблытанай гісторыі. Калі будзе ўстаноўлена, пісалі мы ў мінулы раз, што ніхто з членаў сям'і дагавор на аказанне паслугі не падпісваў, прадпрыемства адмаўляецца ад іскавага патрабавання, суд справу спыняе, і гэта з'яўляецца падставай для спісання бухгалтарам налічанай неправамерна, калі так атрымаецца, запазычанасці. У суд павінны былі з'яўляцца ўсе члены сям'і з пашпартамі. Іх подпісы павінны былі зверыць з тымі, што стаялі ў дагаворах. Прадстаўнік прадпрыемства гаварыў, што будзе дастаткова простага параўнання, аднак у выпадку неабходнасці можа быць прызначаная і графалагічная экспертыза.

Нагадаем яшчэ раз, што гэтую гісторыю і скаргі ад жыхароў вёскі Хатынічы мы пачулі ў сакавіку. Суды толькі рыхтаваліся, таму і рэдакцыя чакала, не здымаючы праблему з кантролю. Праз нейкі час у «Звязду» пачалі звяртацца ўжо іншыя заяўнікі — са скаргамі на прынятыя рашэнні. Адна заяўніца нават кінула, што палову вёскі зрабілі дурнямі...

Пра тое, як ідзе разгляд іскаў, мы папрасілі расказаць **юрысконсульта прадпрыемства «Ганцавіцкая жыллёва-камунальная гаспадарка» Юлію КРЫВУЛЕЦ.** Дарэчы, стэлефанавацца і пагутарыць з ёй атрымалася толькі прыкладна праз тыдзень пасля нашага першага звароту: ці не кожны дзень Юлія Уладзіміраўна ўдзельнічае ў пасяджэннях судах.

— Па стане на пачатак сакавіка нашым прадпрыемствам быў пададзены 51 іск на агульную суму 3 637 130 рублёў. На сёння разгледжана з гэтай колькасці 29 іскаў на суму 2 144 910 рублёў. Ужо з гэтай колькасці суд задаволіў на нашу карысць 16 іскаў (адзін з такіх іскаў датычыўся запазычанасці не толькі за вываз бытавога смецця, але і за ваду) на суму 1 292 810 рублёў, — распавяла нам Юлія Крывулец. — Грамадзянамі да суда пагашаны запазычанасці па 5 ісках на суму 282 830 рублёў. Яшчэ наша прадпрыемства само адмовілася па розных прычынах ад спагнання запазычанасці па 8 ісках на агульную суму 569 270 рублёў.

Як патлумачыла далей больш падрабязна суразмоўца, сярод прычын была, напрыклад, такая: у дагаворы на заключэнне паслугі па вывазе бытавога смецця распісалася жонка, але пры гэтым паставіла ініцыялы свайго мужа. Акрамя таго, як пастанавілі органы ўнутраных спраў, у асобных справах немагчыма было ўстанавіць асобу, што пакінула подпіс, хоць у дзеяннях такой асобы бачыцца склад злачынства. Прадпрыемства адмовілася ад такіх іскаў. Дарэчы, ніводнай графалагічнай экспертызы, пра якія згадвалася на пачатку канфлікту абодвума бакамі канфлікту, не было, паколькі гэта дарагая справа. Дакладнасць подпісаў праводзілася звычайным параўнаннем. Паводле слоў Юліі Уладзіміраўны, тыя з вяскоўцаў, у дачыненні якіх суд прызнаў іх неправамоцнасць, цалкам прызнавалі свае подпісы. Чаму ж тады не пагаджаліся аплацыць запазычанасць да суда? Сярод найбольш частых адказаў: распісаліся, а за што — забыліся ці не зразумелі, пад чым паставілі подпіс.

І толькі адна жанчына, іск у дачыненні запазычанасці якой разглядаўся ўжо ў маі, як заўважыла юрысконсульт Юлія Крулец, падала пасля рашэння суда (не на яе карысць, натуральна) касацыйную скаргу ў Брэст. Прадпрыемства ў сваю чаргу таксама збіраецца яго аспрэчыць. Разгляд некаторых іскаў перанесены на нейкі час. Галоўная найбольш характэрная прычына: гаспадар выехаў на заробкі. Такія справы плануецца разгледзець цягам прыкладна бліжэйшага месяца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Считать недействительным страховой полис СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию транспортных средств граждан формы **2РН серии БГ № 0002409**. УНП 102332274

НАША ПРЫВАТНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ — СВЯШЧЭННАЯ І НЕДАТЫКАЛЬНАЯ?

У многіх краінах прыватнай уласнасці надаецца асаблівая ўвага, яна ахоўваецца законам, а замах на прыватную ўласнасць лічыцца цяжкім злачынствам.

Убачыўшы па тэлевізары, што ў амерыканскіх дамах дзверы даволі кволыя, са шклянымі ўстаўкамі, наш чалавек здзіўляецца гэтаму, бо такія ўваходныя дзверы можна выбіць адным ударам. Іншая справа ў нас — дзверы супрацьударныя, з некалькімі замкамі, а бывае, што і з кратамі на вокнах.

Зладзеяў і ў Амерыцы хапае, але там таго, хто незаконна пранік у дом і нават нічога не ўхапіў, чакае суровае пакаранне.

Давялося сустракацца з пенсіянерам, які ад рэлігійнай абшчыны наведаў Амерыку. Там чалавеку зрабілі аперацыю на сэрцы, уставілі зубы, а ён вярнуўся і кажа:

— Амерыканцы — нядобрыя людзі: калі зойдзеш без дазволу на іх зямлю, то і забіць могуць.

Хоць дзед і «перагнуў палку», але яго выказванне сведчыць, што амерыканскі грамадзянін мае шырокія паўнамоцтвы пры абароне сваёй маёмасці — аж да прымянення зброі.

На постсавецкай прасторы такі прэцэдэнт ужо быў. Успомнім, як былы літоўскі прэзідэнт А. Бразаўскас узнагародзіў фермера, які застрэліў двух вымагальнікаў.

У нас бы такому фермеру прад'явілі абвінавачанне ў «перавышэнні самаабароны» і яму сяўсіў бы не медаль, а турма. Налёты на дачы нашых грамадзян не здзіўляюць. Зімой дачы абкрадаюць, а летам злодзей «гаспадарыць» на агародах. Жанчына палівае, поўзае па зямлі — праполвае, а «ханыга» выкарыстае момант — і цыбулю, часнок... апрыходуе. І злодзею, калі яго нават схопяць за руку, пагражае самае большае штраф у некалькі базавых. Падлічаць, якую шкоду ён нанёс, а цыбуля на шмат не пацягне... А калі гаспадар злодзею нанясе траўму, то можа апынуцца на лаве падсудных за «перавышэнне...». Гэта звязана з нашым стаўленнем да прыватнай уласнасці.

Але мы забываем, што менавіта прыватная ўласнасць дае чалавеку пэўную свабоду — пачуццё незалежнасці. І такім грамадзянінам кіраваць ужо цяжкавата, бо ў яго ёсць апора — уласнасць.

Заснавальнікі марксізму-ленінізму бачылі ў прыватнай уласнасці найбольшае зло, і пасля рэвалюцыі 1917 года ў Расіі па ўласнасці быў нанесены асноўны ўдар. Заводы рабочым, а зямлю сялянам ніхто не збіраўся перадаваць, неабходна было расправіцца з уласнікам — пазбавіць яго апоры. Пачалі з капіталістаў і памешчыкаў, а закончылі рамеснікамі і сялянамі.

Селянін нават з канём уяўляў для Савецкай улады пагрозу. Колькі слёз было праліта, калі забіралі тую зямлю, каня, маёмасць... Улада не хацела спецыяльна зрабіць, каб чалавеку жылося дрэнна, але весці яго ў «прекрасное далёко» з канём не атрымлівалася. Конь даваў чалавеку свабоду выбару — не трэба было ісці на паклон да брыгадзіра, каб зааграць агарод. А такая свабода паражала будаўніцтву камунізму. І ў выніку чалавек павінен быў працаваць бясплатна.

Нават раб у Старажытным Рыме меў права на ежу, віно і жанчыну.

Знікла прыватная ўласнасць, а з ёю адышоў у нябыт і гаспадар, якога нам сёння так не хапае.

Існуе яшчэ адзін шлях да свабоды — гэта зусім адмовіцца ад уласнасці. Такі шлях добра вядомы па Новым Запавеце. «Прадай маёмасць тваю і раздай жабракам, і будзеш мець скарб на небе, бо «зручней вярблюду прайсці скрозь ігольнае вушка, чым багатаму трапіць у Царства Божае» — раіў заснавальнік хрысціянства, але ісці гэтым шляхам ахвотнікаў мала. Ды і яго паслядоўнікі не спяшаюцца раздаваць сваю маёмасць. Больш рынадна быць багатым і свабодным, чым манахам, бамжом ці пацыентам спецустановы.

З ліквідацыяй прыватнай уласнасці ў Савецкім Саюзе ўзнік чалавек «новай фармацыі» — абыякавы прыстасаванец, якога нават не ўскалыхнуў распад Саюза. Праўда, адстаюць «вялікую Радзіму» не захацела і 19 млн камуністаў.

Савецкія ідэолагі заходняму індывідуалізму супрацьпастаўлялі сацыялістычны калектывізм, які часта зводзіўся да наступнага: пяць дзён працуеш на прадпрыемстве, а на выхадныя дапамагаеш калгасу. Але наш калектывізм не ўстаяў перад іх індывідуалізмам, бо першы трымаўся на голай ідэі, а другі — на прыватнай уласнасці.

У краінах, дзе пануе прыватная ўласнасць, «цёмных плям» хапае, асабліва ў некаторых рэгіёнах Лацінскай Амерыкі, Азіі, Афрыкі. Але ў цывілізаваным свеце эканоміка з прыватнай уласнасцю з'яўляецца больш эфектыўнай, чым там, дзе ўласнасць дзяржаўная. Пагодзімся з нобелеўскім лаўрэатам Ф. фон Хайекам, які пісаў, што хоць у нашай *(капіталістычнай)* сістэме шмат недахопаў, але лепшай чалавецтва не прыдумала.

Нашых новаспечаных капіталістаў, акрамя грошай, сёння мала што цікавіць. Першае пакаленне яшчэ галоднае, але прыйдуць іх дзеці, унукі...

Мы выпалі з натуральнага гістарычнага працэсу, і цяпер неабходна ўключыцца ў яго.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Хочаце — верце...

ШТО Ў ІМЕНІ ТВАІМ?

Часам становіцца шкада, што людзі самі сабе імя не выбіраюць. А паспрабуйце высветліць, што азначае ваша імя. Раптам тое, што вы даведаецеся, прымусіць вас паставіцца да яго інакш. У імені кожная літара нясе свой глыбокі сэнс, кожная літара з'яўляецца сімвалам, які нясе ў сабе пэўную характарыстыку.

Уплыў літар у імені неаднолькавы па сіле. Найбольшае значэнне мае літара, якая пачынае слова, за ёй ідзе найбольш чутная і тая, што паўтараецца не адзін раз. Напішыце сваё імя і выберыце значэнне тых літар, з якіх яно складаецца.

А — знак пачатку, роля першай скрыпкі, вяршэнства й любых акалічнасцях, прага фізічнага і духоўнага камфорту, ініцыятыўнасць і неўтаймоўнае імкненне да дзеяння.

Б — душэўны рамантызм, сталасць, трываласць, прабіўныя здольнасці, імкненне фінансава забяспечыць сваё жыццё.

В — камунікабельнасць, сувязь з жыццём, яднанне з прыродай. Творчая асоба, накіраваная ў будучыню.

Г — імкненне да ведаў, дапытлівасць, схільнасць да містыкі, дакладнасць, добрасумленнае стаўленне да ўсяго, за што б чалавек ні ўзяўся.

Д — экстрасэнсорныя здольнасці, дасцярожнасць, абдумванасць у прыняцці рашэнняў, добразычлівасць, спагадлівасць, вернасць і ў сямейным жыцці, але часам капрызнасць.

Е — імкненне да самавыяўлення, патрэба да ўзаемнага абмену ідэямі, схільнасць да ролі пасярэдніка ў канфліктных сітуацыях, праніклівасць, інтуітыўнае разуменне свету таемнага і незразумелага, часам балбатлівасць.

Ё — мэтанакіраванасць, ідэйнасць, шчодрасць, велікадушнасць, шырыня поглядаў, уменне падняцца над мітуснёй; здольнасці псіхолага, уменне разбірацца ў людзях і дапамагчы тым, хто жыве ў нястачы.

Ж — эмацыйнасць натуры, энергічнае самавыяўленне, бурны запал, які не заўсёды можа быць стрыманы, багаты ўнутраны свет, некаторая ўтоенасць, жаданне як імпульс да дзеяння.

З — моцнае ўяўленне і інтуіцыя, імкненне адгарадзіцца ад вонкавай рэчаіснасці і жыць у сваім замкнёным свеце, у складаных сітуацыях ухіляцца ад рашэння праблем.

І — высокі інтэлект, ранімая душа, адчувальнасць, дабрыня, міралюбнасць, рамантычнасць пад маскай абыякавасці.

К — максімалізм, утоенасць натуры, уменне трымаць усё ў сабе, у тым ліку і чужыя сакрэты, сіла духу, мужнасць, уменне разбірацца ў людзях і пранікаць у сутнасць рэчаў.

Л — артыстычнасць, таленавітасць, тонкае ўспрыманне прыгажосці навакольнага свету, адкрытасць і шчодрасць душы, тактоўнасць у адносінах з партнёрамі, імкненне выканаць сваё прызначэнне.

М — клапатлівае стаўленне да сваіх блізкіх, гатоўнасць пайсці насустрач любой просьбе, але ёсць і некаторая прыземленасць, практычнасць. Любоў да прыроды.

Н — супярэчлівасць і ўтоены пратэст супраць усякага дыктату, ушчамлення, крытычнае мысленне, самалюбства, імкненне да прызнання, ранімасць, творчыя здольнасці, спагадлівасць, самадастатковасць, імкненне да высокага і расчараванне, дрэннае здароўе.

О — глыбокія пачуцці, любоў да грошай, эканомнасць і развазнасць, моцна развітая інтуіцыя, імкненне зразумець сэнс жыцця і прызначэнне чалавека на гэтай зямлі.

П — ініцыятыўнасць, мноства ідэй, свой уласны погляд на рэчы, упэўненасць, непахіснасць і перакананасць, аналітычны розум, схільнасць да абагульненняў.

Р — праніклівы розум, самаўпэўненасць, цвярозая ацэнка рэальнасці, рашучасць, здольнасць да дзеяння, часам неапраўданая рызыка, катэгарычнасць меркаванняў.

С — разважнасць, імкненне да пастаянства, трываласці адносін, матэрыяльнай забяспечанасці, камфорту, здольнасць ісці сваім уласным шляхам. Уладарнасць, часам раздражняльнасць і незадаволенасць навакольнымі, якая хутка праходзіць.

Т — праўдалюбства, максімалізм, катэгарычнасць меркаванняў, сентыменталізм, няздольнасць цвяроза ацэньваць свае магчымасці. Гэтая літара — знак крыжа, які нагадвае ўладальніку пра неабходнасці рашучых дзеянняў прыажыццяўленні сваіх ідэй і канечнасці чалавечага быцця.

У — развітае ўяўленне, велікадушнасць, дабрачыннасць, імкненне да самаўдасканалення, схільнасць да адкрытых выказванняў, некаторая ўтапічнасць ідэй.

Ф — схільнасць адчуваць сябе цэнтрам Сусвету, самабытнасць, задавальненне рабіць людзям дабро, бачыць іх шчаслівымі, блытаніна ў поглядах на жыццё, непаслядоўнасць мыслення, супярэчлівасць натуры, пустое фразёрства і схільнасць да перабольшання і нават хлусні.

Ш — прыстасавальніцтва, уменне карыстацца выпадкам і сітуацыяй, здольнасць да хуткай арыентацыі ў сітуацыі ўладжвання спраў з максімальнай для сябе выгадай.

Э — вялікія здольнасці да вывучэння замежных моў, прамоўніцкага мастацтва; уменне каротка і ёмка выказваць свае думкі; літаратурны талент, дапытлівасць, якая перамяжоўваецца з цікаўнасцю, спрыт, ганарыстасць і некаторае пазёрства.

Ю — любоў да грамадскіх навук, палітычнай дзейнасці, лідарства; красамоўства, здольнасць да самаахвяравання, роўна як і да жорсткіх учынкаў.

Я — пачуццё ўласнай годнасці і павага да сваёй асобы, абаяльнасць, абыякавасць, здольнасць прыцягваць сімпатыі людзей і веру іх у свае магчымасці, уменне дамагацца пастаўленай мэты і адстойваць свае інтарэсы.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА 28.06.2011 в 11.00

по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. № 204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на три года для использования в целях для размещения офисов, производственных площадей, (за исключением вредных производств), складских помещений, осуществления торговли

Адрес арендуемого имущества	№ Лота	Площадь, кв.м	Коэффициент от 0,5 до 3,0	Начальная цена продажи	Размер задатка	Характеристика
1		2	3	4	5	6
Капитальное строение, здание специализированное связи, здание АТС-2, 3-й этаж, часть помещения, отдельные помещения. г. Лида, ул. Чапаева, 3.	Лот № 1	47,3;	2,0	413 875	41 388	Помещения расположены на 3-м этаже четырехэтажного здания в центральной части города. Здание имеет удобные подъездные пути. В помещениях имеется естественное освещение, водоснабжение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизированы. Указанные площади будут выставляться на продажу права заключения договоров аренды 7 лотами.
	Лот № 2	13,3;	2,0	116 375	11 638	
	Лот № 3	9,4;	2,0	82 250	8 225	
	Лот № 4	70,4;	2,0	616 000	61 600	
	Лот № 5	22,9;	2,0	200 375	20 038	
	Лот № 6	41,2;	2,0	360 500	36 050	
	Лот № 7	8,4	2,0	73 500	7 350	
Капитальное строение, здание специализированное связи, здание АТС-2, 4-й этаж, отдельное помещение. г. Лида, ул. Чапаева, 3.	Лот № 8	9,5	2,0	83 125	8 313	Помещение расположено на 4-м этаже четырехэтажного здания в центральной части города. Здание имеет удобные подъездные пути. В помещении имеется естественное освещение, водоснабжение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизировано. Указанная площадь будет выставляться на продажу права заключения договоров аренды 1 лотом.

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору следующие документы: заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, копию платежного документа о перечислении задатка, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000000225 в филиале 426 АСБ «Беларусбанк» код 199, УНП 500826567 Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 202 **с 27.05.2011 по 27.06.2011 включительно** в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после **16.00 27.06.2011,** не рассматриваются.

Телефоны для справок (0152) 43 25 71, 48 65 95, факс (0152) 72 02 07.

г. ВИТЕБСК 30.06.2011

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 50 %

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1	Неиспользуемое здание склада грузового прирельсового с рампой, расположенного по адресу: Шумилинский район, г.п. Шумилино (ст. Шумилино, 569 км-570 км), ул. Вокзальная, 15/3, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 203/С-16381 – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бетонный, крыша шиферная, общая площадь 262,3 кв.м. Назначение – здание склада грузового прирельсового с рампой; Земельный участок: с кадастровым номером 225855100002000001 площадью 0,0765 га для обслуживания недвижимого имущества с возможным использованием его под объект, предназначенный для оказания услуг, производства товаров, выполнения работ или под объект торговли, сроком аренды 50 лет.	36 110 621	3 611 060
2	Здание растворобетонного узла с деревянной галереей, расположенное по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, промышленная зона, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 252/С-10275 (здание специализированное обрабатывающей промышленности), трехэтажное кирпичное, частично деревянное, общая площадь 360,9 кв.м, объем 2016 куб.м, фундамент бетонный, перекрытие железобетонные плиты, крыша рулонная. Земельный участок: с кадастровым номером 241800000009002107, площадь 0,0438 га для содержания и обслуживания растворобетонного узла, сроком аренды 20 лет. Использование – под объект административного, производственного, коммунально-хозяйственного назначения.	131 606 670	13 160 660

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

Аукцион состоится 30.06.2011 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

Заявления на участие в аукционе принимаются

«МУЗЫ НЯСВІЖА»
ЗАВІТАЮЦЬ У ПАЛАЦ РАДЗІВІЛАЎ НАЛЕТА

Кларнетыст Уладзімір Солтан і піяністка Дар'я Мантвалінская (другая справа) на фестывалі «Музы Нясвіжа».

У Нясвіжы ў 16 раз прайшоў фэст камернай музыкі «Музы Нясвіжа», галоўным ініцыятарам якога з'яўляецца Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

Частка першая. ГЕНІІ ГУКУ

Фестываль «Музы Нясвіжа» — гэта насамрэч унікальны культурны праект. Па некалькіх прычынах. Па-першае, менавіта тут можна пачуць музыку, якую не пачуеш больш нідзе. Па-другое, менавіта гэты фэст даў старт іншым падобным фестывалям у Беларусі, напрыклад, музычнаму фестывалю ў Заслаўі. Па-трэцяе (і гэта, відаць, самая галоўная прычына), фестываль патрэбны людзям. Кожны год «Музы Нясвіжа» праходзяць пры поўных залах. Няхай невялікіх, але ж і Нясвіж горад па сваіх маштабах не аграмадны. Людзі цягнуцца да музыкі, яны ўдзячныя арганізатарам за тое, што маюць магчымасць дакрануцца да высокай культуры ў сваім раённым цэнтры, бо ведаюць, што некалі, пры Радзівілах, іх родны горад быў бадай цэнтрам Еўропы. Міхаіл Фінберг распавядае, што калі ён гуляе па Нясвіжы ў дні фестывалю, ды і ў іншыя дні, то яго заўжды спыняюць людзі і дзякуюць яму за свята мастацтваў, якое прывозіць з сабой аркестр маэстра. Людзям прыемна, калі нешта робіцца адмыслова для іх, яны гэта адчуваюць усім фібрамі. Ім прыемна слухаць прафесара Вольгу Дадзіёмаву, навуковага кіраўніка фестывалю, якая цікава і даступна распавядае пра кожную музычную кампазіцыю. Яна распавядае і пра манаха Вівальдзі; і пра віртуозную ігру беларускіх музыкаў, якія перамагаюць на самых прэстыжных міжнародных конкурсах; і пра нясвіжскіх кампазітараў Мацея Радзівіла і Яна Голанда. Яна распавядае проста, лёгка. І тады людзі адчуваюць, што мастацтва размаўляе з імі на адной мове, што мастацтва ім патрэбна таксама, як мастацтву патрэбныя яны.

Нашы музыкі, дарэчы, сапраўды ўражваюць. Большасць, можа, і не здагадваецца, але ў галіне музыкі нам сапраўды ёсць чым ганарыцца. Вось, напрыклад, кларнетыст, саліст аркестра Фінберга Уладзімір Солтан, сын вядомага беларускага кампазітара. Вы б толькі пабачылі, нават не пачулі, а спачатку менавіта пабачылі, як ён грае! Здаецца, што перад вамі нейкі звышчалавек, надзелены нейкім неверагодным дарам. Бо як можна так іграць, як можна так дакладна і прыгожа выконваць самыя складаныя творы! «Цыцыльяна» Габрыэля Фарэ, творы Каміля Сен-Санса, «Мятлік» Аляксандра Ільінскага... Такіх музыкантаў, як Уладзімір Солтан, можа, усяго некалькі ва ўсім свеце. Як мне патлумачыла музыказнаўца Надзея Бунцэвіч, ёсць такія мелодыі, якія кампазітары знарок пішуць так, каб іх ніхто не змог сыграць. На такую музыку аб'яўляецца конкурс (тэндар). Віртуозных кампазіцый, якія могуць выканаць толькі выбраныя музыкі, ва Уладзіміра Солтана набярэцца на цэлы сольны канцэрт. А ў хуткім часе, дарэчы, ён збіраецца запісаць дыск.

Наогул, усе салісты аркестра Міхаіла Фінберга — гэта выкшталцоныя выканаўцы, геніі дакладнага гуку. Узровень найвышэйшы. Нездарма, дарэчы, сёлета аркестр атрымаў званне «акадэмічнага».

Праграма фэсту «Музы Нясвіжа» гэтага года была багатая. Ад музыкі еўрапейскага барока да джазавых кампазіцый. Але паміж імі — самае цікавае. Музыка, якую не пачуеш нідзе. Музыка беларускіх кампазітараў XX стагоддзя — Антона Абрамовіча, Дзмітрыя Лукаса, Аляксея Туранкова, Рыгора Пукста, Уладзіміра Солтана і інш.

— Так атрымалася, што гэтая музыка не гучыць ні ў філармоніі, ні па радыё, ні па тэлебачанні, — **засмучаецца Міхаіл ФІНБЕРГ**, — Мы даём слухачам унікальную магчымасць пачуць нашу беларускую музыку еўрапейскага ўзроўню. Мы стараемся не абмінуць беларускіх кампазітараў і заўжды рыхтуем тэматычныя праграмы. Вось, напрыклад, 100-годдзе з дня нараджэння Дзмітрыя Лукаса, 115 гадоў з дня нараджэння кампазітара Туранкова, 110 гадоў з дня нараджэння Рыгора Пукста, які пайшоў з жыцця ў 60 гадоў — якраз у дзень народзінаў. І ў гэтым годзе мы адзначаем 100 гадоў з дня нараджэння цудоўнага беларускага кампазітара Пятра Падкавырава.

Наступны фестываль «Музы Нясвіжа», як абяцае маэстра, вернецца да музыкі, з якой пачынаўся, бо выросла ўжо новае пакаленне нясвіжцаў, якія не ведаюць вытокаў, не чулі музыкі беларускага сярэднявечча і г. д.

Частка другая. ДЫХАЦЬ ГОРАДАМ

Нясвіж — гэта заўжды асаблівыя адчуванні. Маленькі правінцыйны, але неверагодна ўтульны і велічны горад прыцягвае сваім спакоем і злагадай, сціплай шляхетнасцю. Сціплай сёння, бо раней, калі квітнеў на Беларусі славуты род Радзівілаў, Нясвіж сапраўды быў у самым цэнтры Еўропы. І як неперадавальна здорава ў Нясвіжы слухаць музыку, якая раней якраз і гучала ў дамах і палацах шляхты і арыстакратыі.

Мае першыя ўражанні пра Нясвіж — школьныя. Памятаю брудна-жоўтага колеру сцены палаца Радзівілаў, цьмяны тунэльчык паміж мостам праз абарончы роў і палацавым дворыкам, памятаю расповеды экскурсавода пра прывід Барбары Раздзівіл. Сёння палац Радзівілаў — гэта нешта штучна-карціннае. Прынамсі, пакуль у мяне стварылася такое ўражанне. Горача, пыльна, людна. Вясёлыя маладыя хлопцы-будаўнікі нешта напаспех дабудоўваюць, кладуць кафлю, дакладаюць цаглiны, жартуюць паміж сабой. І, здаецца, не здагадваюцца, да ЧАГО маюць непасрэднае дачыненне. Па сутнасці, да беларускай святыні. Да месца, якое ўвасабляе сабой велiч і годнасць, непасрэднасць і бесшабашнасць беларускай шляхты. Ці ведаюць яны, хто ў Нясвіжы наладзіў зіму летам і катаўся на санях, запрэжаных мядзведзямі? Ці ведаюць яны, як спаборнічаў Караль Радзівіл з Міхалам Клеафасам Агінскім у ігры на кларнеце, змагаючыся за руку і сэрца Аляксандры Сапегі?..

Паміж канцэртамі фэсту «Музы Нясвіжа» я паспела тры разы «злётаць» у палац Радзівілаў. Адчуванне незвычайнае. Быццам ляціш на спатканне з вечнасцю. Праўда, крыху расчароўваешся, калі прылятаеш... Спачатку я абышла ўсё вакол палаца. У тым лiку і ўнікальны радзівілаўскі парк, у гэтую пару ўвесь усыпаны незабудкамі! І які, дарэчы, таксама збіраюцца крыху аднаўляць.

— Ужо распрацаваны праект па аднаўленні парку, — распавядае **Іван КРУПКО, старшыня Нясвіжскага раённага выканаўчага камітэта**. — Там будзе адноўлены, напрыклад, домік садоўніка, яшчэ некаторыя архітэктурныя збудаванні, якія былі пры Радзівілах. З боку парка адновім уезд у атэль і на гаспадарчы двор палаца. Ніякіх іншых збудаванняў, ніякіх атракцыёнаў на тэрыторыі парку не будзе, бо гэта несумяшчальна.

Потым я пайшла пазнаёміцца з экспазіцыяй. Не ведаю, пашчасціла мне ці не, але так атрымалася, што мне ўдалося паслухаць экскурсавода, які распавядаў пра палац для

Палац Радзівілаў сёння.

курсантаў акадэміі МУС. Шчыра прызнаюся, не спадабаліся дзве рэчы. Ну, перадусім, чаму нельга весці экскурсіі ў палацы Радзівілаў па-беларуску? Такое набалелае пытанне, што аж скончыліся ўсялякія словы, каб абурацца. Беларускую мову і так не часта пачуеш. Дык музеі (а тым больш такія!) і ўсялякія іншыя ўстановы культуры павінны ў першую чаргу дбаць пра нацыянальную мову! Па другое, здзівіла мяне і абсалютная неадпаведнасць вонкавага выгляду экскурсавода навакольнаму асяроддзю. Гэта была жанчына ў вельмі гламурным, вельмі стракатым адзенні... Праўда, нікога не хачу пакрыўдзіць, але ўсё-ткі такое месца працы, як радзівілаўскі палац, павінна ж, напэўна, абавязваць да нейкай больш эстэтычнай самапрэзентацыі...

І яшчэ такая акалічнасць. Насцярожыла тое, што рэстаўрацыя палаца Радзівілаў ідзе вельмі хуткімі тэмпамі. Пачалася яна ў 2004 годзе. Усяго плануецца каля 50 экспазіцыйных пляцовак у сценах палаца. На сёння працуе ўжо 13. А да канца года плануецца цалкам скончыць усе працы па рэстаўрацыі і музефікацыі (гэта значыць запоўніць залы экспанатамі!). Хоць зараз каштоўнасць таго, што ўжо ўзноўленых 13 залаў, пад вялікім пытаннем, бо гэта пераважна копіі і муляжы...У канцы сёлетняга чэрвеня, па словах Івана Крупко, будуць скончаны ўсе будаўнічыя работы на тэрыторыі палаца. На маё пытанне пра тое, ці паўплываюць хуткія тэмпы рэстаўрацыі на якасць, Іван Іванавіч не адказаў, але патлумачыў:

— Чаму першыя гады марудна ішла рэканструкцыя? Таму што вяліся даследаванні, вывучаліся фундамент, сцены. А зараз, калі ўжо ўсё вывучана, выдадзена праектная дакументацыя па рэканструкцыі, засталося толькі хутка папрацаваць рукамі. Да 23 чэрвеня скончацца ўсе будаўнічыя працы, будаўнічыя адтуль сыдуць, застануцца роспісы, пакрыццё золатам. Там буду працаваць творчыя людзі, улетку, восенню. Часу будзе дастаткова, каб скончыць гэтыя працы. Экскурсіі могуць ужо праводзіцца, а паралельна мастакі будуць распісваць залы. Я думаю, што турыстам гэта таксама будзе цікава: як вядуцца роспісы, як пакрываюць золатам і г. д.

Старшыня Нясвіжскага райвыканкама разлічвае на тое, што з наступнага года «Музы Нясвіжа», калі не стала прапішуцца, то часткова ўвойдуць у інтэр'еры палаца Радзівілаў.

Акрамя палаца і неверагоднай атмасферы, ёсць у Нясвіжы і ўнікальны фарны касцёл

Палац Радзівілаў сёння.

Божага цела, які пабудаваў італьянскі архітэктар Бернардоні. Унутры касцёл аздоблены адмыслова: сцены і калоны ўпрыгожвае ўнікальны роспіс, які выканаў мастак Г. Д. Гескі. Гэты касцёл таксама плануецца адрэстаўраваць. Сёння ўжо вядзецца экспертыза, а ў чацвёртым квартале бягучага года пачнуцца працы па аднаўленні.

З кожны годам, згодна з афіцыйнай статыстыкай, колькасць турыстаў у Нясвіжы павялічваецца. Калі ў 2008 годзе — 92 тысячы, у 2009 — 120 тысяч, то ў 2010 — каля 190 тысяч. Мяркуецца, што сёлета Нясвіж наведаюць 220—230 тысяч турыстаў. Безумоўна, гэта выдатная дынаміка. Але нам варта зрабіць так, каб сярод гэтых турыстаў былі не толькі замежныя госці, але і самі беларусы. Бо хто, як не мы самі, павінны ў першую чаргу ведаць свае славутасці, сваю гісторыю. Касір Валянціна Сімакова, што прадае квіткі на экспазіцыю ў палац Радзівілаў, расказала, што турысты ў Нясвіж прыязджаюць з усіх куткоў свету: ад Расіі да Амерыкі. А раз да нас едуць іншыя, то нам сапраўды ёсць чым ганарыцца. Няхай гучыць музыка!

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Унікальны роспіс Нясвіжскага фарнага касцёла Божага цела.

Натура

«ДАЛЕЙ БЫ ТАК ЖЫЦЬ»

Бацькі на кухні абедалі, калі ў калідоры шчоўкнуў замок і пачуўся голас дачкі:

— О-о, як пахне грыбамі... кашмар...

Праз секунду яна з'явілася на кухні.

— Зайшла ў вашу краму — кашмар.

— А ты сядай да стала, — маці паставіла талерку з грыбным квасам, а бацька адсунуўся бліжэй да акна. Дачка зачарпнула лыжку.

— Ну, мама, ты ўмееш — такі наварысты. А я зазірнула ў каўбасны аддзел... жах...

— А што ў каўбасным рабіць... каўбаса не наедак. Вось я купіла тры мясных наборы па 4 тысячы, то і на плоў хапіла, і яшчэ тыдзень есці будзем.

— Мама, які плоў? Ты ведаеш, па чым рыс?

— Мы з бацькам 30 кілаграмаў яшчэ па тры тысячы купілі... вунь на балконе вісіць — надоўга хопіць.

— Хопіць, — пацвердзіў бацька, — а ў гаражы два мяхі цукру... то хопіць.

— На рынку капуста па сем тысяч... кашмар, — уздыхнула дачка і ўзялася за плоў.

— Колькі там у нас квашанай... слоікаў дзесяць яшчэ, а грыбы сушаныя, яшчэ пазалеташнія, то, Марынка, возьмеш... — гаварыла маці, наліваючы дачцэ кампот з клубніц.

— Вы ведаеце, па чым бананы? А апельсіны? Кашмар!

— Сёлета бэры летняя добра цвілі, ды і позняя на ўраджай паказваюць... што банан у параўнанні з нашымі грушамі. З яблыкамі слабавата, а грушы будуць, — разважаў бацька. — Можа, вясна і пазнаватая, але не з горшых...

— А як там Юрык? Даўно не заглядваў...

— Ды ўсё круціцца... вунь счапленне паляцела, то мільён выкінулі... — уздыхнула дачка. — Як жыць?

— Вы ж машыну месяц таму як купілі, такія грошы ўвалілі... А мой «жыгуль» нічога, бегае...

— Тата! Пра што ты кажаш? Ну хто сёння на «жыгулях» ездзіць?

— А чаго, на дачу ды ў грыбы... на наш век хопіць, а форс нам не патрэбен, — пачаў разважаць бацька, але Марына яго перабіла.

— Прычым тут форс. Паглядзелі б, як людзі жывуць, — яна ўстала, падцягнула джынсы і пачала з чарпака піць кампот.

— А чаго, вунь увесь дом так жыве. Колькі пад вокнамі машын стаіць, — кінуў бацька і пайшоў з кухні.

Марына зірнула ў вакно:

— Чырвоная «шкода» чыя?

— Ды Журбаны купілі. І адкуль у людзей грошы?

У голасе маці чулася ці то шкадаванне, ці то крыўда, і яна пачала пакаваць дачцэ прадукты. Паставіла на стол бутэльку алею, дастала з халадзільніка ўпакоўку рабрын, прынесла з балкона крупы...

— Мама, а грэчка адкуль? — здзівілася дачка. — Кашмар!

— Адтуль, адкуль і рыс — гэта вы жывяце сённяшнім днём. Не трэба гнявіць Бога. Далей бы так жыць.

Гаспадыня палезла ў маразільнік і зашамацела пакетамі.

— Вось марожаныя ягады... вішня..., можа, не растануць, а бацька прывязе з гаража капусты, памідораў, то можа потым возьмеш... Ледзь не забыла, сушаных грыбоў вазьмі...

— Як жыць... возьмеш сто тысяч — туды-сюды і няма... кашмар, — скардзілася дачка.

— То можа вам крыху грошай... мы адну пенсію адкладваем. Але потым, бацька здыме.

А ўжо на выхадзе, калі дачка з двума пакетамі падышла да дзвярэй, маці ўздыхнула:

— Бульбу трэба ўжо абганяць... Можа, на выхадныя на дачу пад'ехалі б?

— Мама! Якая дача, якая бульба, дзяцей трэба... часу няма... Кашмар!

— Ну добра, добра, — супакоіла дачку маці і адчыніла дзверы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.52	21.22	16.30
Віцебск —	4.34	21.19	16.45
Магілёў —	4.42	21.13	16.31
Гомель —	4.46	21.01	16.15
Гродна —	5.08	21.36	16.28
Брэст —	5.17	21.29	16.12

Месяц

Апошняя квадра 24 мая. Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Глікерыі, Ірыны, Аляксандра, Васіля, Георгія, Макара, Сяргея, Яфіма.*

К. *Марыны, Паўліны, Эвеліны, Паўла, Філіпа, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

26 мая

1926 год — па ініцыятыве З. Бядулі, У. Дубоўкі, К. Крапівы, К. Чорнага створана беларускае літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Узвышша». Аб'яднанне выдавала часопіс «Узвышша», літаратурныя зборнікі. У сваёй дзейнасці арыентавалася на рускую літаратурную арганізацыю «Перавал». У праграмных тэзісах абвяшчалася стварэнне літаратуры, арыентаванай на нацыянальны фальклор і класіку, зацвярджаліся прынцыповае значэнне прафесіяналізму пісьменніцкай працы і ўстаноўка на развіццё культуры мовы, злучэнне рэалістычных традыцый з наватарствам.

1942 год — у Мінску загінуў Уладзімір Амельянюк, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (пасмяротна, 1965). У пачатку вайны апынуўся на акупаванай тэрыторыі ў Брэсце. Прабраўшыся ў Мінск, увайшоў у склад падпольнай групы, быў рэдактарам першага нумара падпольнай газеты «Звязда», удзельнічаў у стварэнні падпольнай друкарні. Імем У. Амельянюка названы вуліцы ў гарадах Мінску, Дзяржынску і Дно Пскоўскай вобласці. У Мінску на плошчы Незалежнасці, на месцы яго гібелі ўстаноўлены мемарыяльны знак, у пасёлку Самахвалавічы Мінскага раёна ў школе, дзе ён вучыўся, пастаўлены бюст.

Цытата дня:

«Ніхто не захоўвае тайну найлепш, чым той, хто яе не ведае».

Фернанда дэ Рохас (1465—1541), іспанскі пісьменнік.

РЫТУАЛЬНАЕ АДЗЕННЕ

Ва ўсе часы, у традыцыях розных народаў свету, у тым ліку і ў культуры ўсходніх славян, у абрадах каляндарнай і сямейна-родавай накіраванасці адзенне мела асаблівае сімвалічнае значэнне. Напрыклад, маскі і «цыганскае» адзенне выкарыстоўвалі тыя, хто ішоў калядаваць; у белае старое адзенне апраналіся валачобнікі ў Велікодныя дні; распраналі ўвогуле, а потым упрыгожвалі шматлікімі кветкамі і вянкамі самую прыгожую дзяўчыну вёскі ў час святкавання Тройцы і на працягу Русальнага тыдня. Асаблівае значэнне надавалася адзенню ў час правядзення сямейна-родавых абрадаў.

● Рытуальнае адзенне заўсёды было своеасаблівым індыкатарам усяго абрадавага дзеяння. Яно акцэнтавала ўвагу на галоўных персанажах, падкрэслівала іх становішча і сацыякультурны статус, вызначала радавую прыналежнасць і праз гэта ўплывала на далейшы лёс тых, хто яе апранаў. Напрыклад, лічылася, што тыя, хто пераапранаўся на Каляды, павінны былі пасля абавязкова прайсці абрад ачышчэння — акунуцца ў палонку на Вадохрышча.

● Цэласнасць адзення заўсёды сімвалізавала адзінства традыцый і сучаснасці. Ці не таму маці на вяселлі сваіх дзяцей павінны надзяваць сукенку. Касцюм (блуза і спадніца) азначаў не што іншае, як разрыў сямейнага жыцця для яе дзіцяці.

● Нашы продкі лічылі, што Раство і Новы год нельга сустракаць у будзённым адзенні — гэта да беднасці.

● Ведалі, што ў святочныя дні каляндарнага цыкла, а таксама ў нядзелю, нельга апранацца ў адзенне цёмнага колеру.

● Парушэннем традыцый лічылася адзенне, апранутае на левы бок, а таксама наадварот (спіной наперад). Прыкмячалі: калі збіраешся ў далёкі шлях і раптам надзенеш адзенне на левы бок — чакай непрыемнасцяў, «быць табе ці п'яным, ці бітым».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Віншуем любую жоначку і матулю **Ганну Пятроўну ПІСАРЫК з днём нараджэння!** Ад усяго сэрца жадаем ёй моцнага здароўя, бадзёрасці і аптымізму, шчасця ў жыцці, павагі родных.

Твае муж і дачушка.

Усміхнемся

Народная мудрасць: калі чабурэк вые на Месяц — значыць, ён яшчэ свежы.

☺

Былая жонка — былому мужу:

— Ты плакаў хоць раз пасля таго, як мы развіталіся?

— Так. Калі бервяно на нагу звалілася.

☺

Нарэшце навукоўцамі аднаго з НДІ ў выніку доўгіх доследаў высветлена, што такое «самае тое». Ім сталі — 200 грамаў гарэлкі, салёны агурочак і бутэрброд з вяндлінай.

☺

Старая — старому.

— Дзед, у нас, здаецца, будуць дзеці...

— Дзіва што! Заўтра пенсію атрымліваем!

☺

Пасля шматлікіх прароцтваў пра будучы Апакаліпсіс, якія ўвайшлі ў традыцыю, застаецца толькі абвясціць канец свету нацыянальным святам і адзначаць яго кожны год.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 19 (398)

Надвор'е і прыметы

● Ранішняя зарніца чырвоная — будзе дождж.
● Уначы выпала густая раса — на пагоду.
● Глухі гром — да ціхага дажджу, рэзкі — да ліўня.
● Птушкі моцна крычаць, нізка лятаюць — перад непагаддзю.
● Спахмурнела неба, а кветкі дзьмухаўцоў раскрытыя — дажджу не будзе.

Півоневы рай

Рымскі пісьменнік Пліній вызначыў півоню як старэйшую з усіх культываваных кветак. Многія сотні гадоў у пекінскіх садах і парках, вакол храмаў вырошчваліся півоні. Цікава, што яшчэ імператар Хінг-Мінг (2737—2697 гг. да н.э.) займаўся кветкамі і вырошчваў півоню ў сваім імператарскім садзе. Так, менавіта з далёкага Кітая прыйшла да нас гэтая кветка. Дзікія гатункі півоні і цяпер жывуць у Кітаі, у Манголіі і ў Міжземнамор'і. У тыя далёкія часы людзі цанілі півоню не столькі за дэкаратыўнасць, колькі за лекавыя ўласцівасці кветкі. Першаадкрывальнікамі ў гэтай галіне былі, вядома ж, кітайцы. З півоні рабілі заспакаяльную настойку, з яе дапамогай лячылі кашаль і боль у сэрцы, здымалі напружанне ў мышцах, сутаргі. Лічылася, што лісты півоні перашкаджаюць зачаццю. Праўда, прымянялі іх даволі дзіўна: клалі ў споднюю бялізну або ў чаравікі. Магчыма, тут ёсць нейкае чарадзейства.

Чаму ў нас любяць півоні? Хутчэй за ўсё, за іх прыгажосць. Яны лёгка пераносяць усе нягоды і лёгка прыстасоўваюцца да нашых кліматычных умоў. Яны любяць сонейка і не вельмі рады ветру. Не вельмі любяць сядзець на паўднёвым баку ля цаглянай сцяны — там ім душна і горача. Не любяць знаходзіцца і ў нізінах, дзе блізка падыходзяць грунтовыя воды. Не любяць, калі іх бясконца турбуюць: дзеляць, перасаджваюць з месца на месца. Дзяліць куст можна ў 6—8-гадовым узросце, не раней. Але чым старэйшы куст, тым цяжэй яго раздзяляць. Працэдуру гэтую лепш праводзіць у жніўні—верасні. Яму лепш зрабіць загадзя, каб зямля асела. Інакш пры асяданні з кустом можа агаліцца каранёвая шыйка і куст будзе дрэнна цвісці. Півоні аддаюць перавагу гліністай або сугліністай глебе і не вельмі любяць пясчаную ці тарфяную. Любяць, калі іх паліваюць, асабліва вясной, калі ідзе іх актыўны рост. І абавязкова сачыце за шыйкай — першай пупышкай на кусце. На лёгкіх пясчаных глебах яе можна заглыбляць на 5—7 см, на суглінках — дастаткова 3—4 см. А яшчэ півоні любяць, калі іх кожны год падкормліваюць, лепш за ўсё — каравяком.

У Расію заморскія півоні трапілі ў XVII стагоддзі. Дзяліліся яны на дзве групы: кучаравыя і сухаватыя: інакш — на махровыя і простыя. Цяперашнія півоні раскучаравіліся так, што ледзь змяшчаюцца ў пяць груп: простыя півоні, паўмахровыя, махровыя, японскія, анемонападобныя.

Салодкія пачаткі

Па колькасці вітамінаў цукровая кукуруза займае адно з першых месцаў сярод агародніннных культур. З яе можна прыгатаваць сапраўдныя далікатэсы. Як лекавай расліне ёй няма цаны. Тыя, у каго ў ежы пераважаюць стравы з кукурузы, радзей хварэюць на атэрасклероз. Экстракты з рыльцаў кукурузы шырока прымяняюцца пры хваробах печані, жоўцевага пузыра, нырачнакаменнай хваробы і цыстытах.

У 20 чыслах мая кукурузу высаджваюць на ўчастку як апору для раслін, якія ўюцца (фасолі, гароху) і як кулісы на агурках. Гэтая расліна патрабуе ўрадлівай, добра ўгноенай глебы, якая добра праграваецца. Вельмі адчувальная да ўгнаенняў. Пры пасадцы ў ямку рэкамендуецца ўносіць паўлітровы слоік паўперапрэлага гною ці кампосту з дабаўленнем па няпоўнай сталовай лыжцы суперфасфату і калійнай солі. Перамяшаць арганічныя і мінеральныя ўгнаенні, высадзіць расаду, паліць марганцоўкай і замульчыраваць ямку перагноем. Пры замаразках расаду трэба ўкрываць.

Больш за ўсё пажыўных рэчываў расліне патрабуецца ў перыяд цвіцення і фарміравання пачаткаў. Да гэтага часу кукуруза фарміруе моцную каранёвую сістэму, гэта дапамагае ёй супрацьстаяць ветру і лёгка пераносіць недахоп вільгаці.

На працягу вегетацыі кукурузу трэба рыхліць і праполваць, паліваць невялікімі дозамі. Зацвітае цукровая кукуруза ў залежнасці ад гатунку на 70—90 дзень пасля ўсходаў. На адным сцябле фарміруецца па 2—3 пачаткі. Убіраць трэба ў фазу малочнай спеласці, калі верхні пласт абгорткі робіцца менш вільготным і туга аблягае пачатак.

Сарваныя пачаткі нельга доўга захоўваць, таму што зерне грубее, а цукру ў ім робіцца менш.

Цукровая кукуруза — любімы пачастунак і для дзяцей, і для дарослых. А яшчэ яе з задавальненнем хрумстаюць свойскія жывёлы, асабліва трусы.

Парады агароднікам

● Цыбулю высаджвайце побач з бульбай. Фітанцыды цыбулі стрымліваюць развіццё фітафторы.

● Паліваюць цыбулю толькі ў пачатку лета. Калі паліваць усё лета, яна не будзе захоўвацца — згніе.

● Каб абеззаразіць цыбулю-сеянку ад трыпсаў, трэба прагрэць яе ў гарачай (45 градусаў) вадзе на працягу 10 хвілін.

● Часнок можна і трэба саджаць побач з таматамі, агуркамі, буракамі і морквай. А вось суседства гароху і фасолі часнок не пераносіць.

● Рэпа любіць, каб яе палівалі падсоленай вадой — тады яна вырастае больш салодкай.

● Ніколі не выкарыстоўвайце попел, атрыманы пры спальванні дрэў, якія выраслі ля шашы. Такі попел змяшчае шмат свінцу і іншых цяжкіх металаў.

● Не саджайце тапінамбур паблізу дарогі: ён лёгка ўбірае шкодныя рэчывы, якія змяшчаюцца ў выхлапных газах.

● Для таматаў карысныя падкормкі хлебам. Пакладзіце 5—6 скарынак ці кавалачкаў чэрствага хлеба ў трохлітровы слоік з вадой і настойвайце некалькі дзён. Затым дабаўляйце па шклянцы гэтага настою на вядро вады для паліву раслін.

● Каб паскорыць саспяванне таматаў, можна зрабіць пазакаранёвую падкормку суперфасфатам. 40 г прэпарату (два пачкі ад запалак) растварыце ў 1 л гарачай вады, пакіньце на адны суткі, а затым пераліце ў вядро, дабаўце 9 л вады: раствор апырсквальнікам нанясіце на кусты.

● Агуркі не варта размяшчаць пасля моркві і фасолі, бо гэтыя культуры пашкоджваюцца адной хваробай — белай гнілью.

● Абсадзіце клубніцы пятрушкай, яна адпужвае слімакоў.

● Пасадзіце ў агародчыку чаромху. Яна ачышчае і араматызуе паветра, адпужвае шкодных насякомых.

Аер — прышэлец з Азіі

Аер (яго яшчэ называюць явар, арэй, шувар, татарская трава) — адна з крыніц дзівосных усходніх водараў. Зацукраваныя карані аеру — каштоўная турэцкая слодыч. Лекавыя ўласцівасці яварнага кораня былі вядомыя і старажытным грэчаскім урачам. Аер рос у Малой Азіі, Персіі, Індыі, Кітаі.

Як жа трапіў ён да нас, у Беларусь? Справа ў тым, што яшчэ ў часы татара-мангольскіх набегаў мангольскія ваяры думалі, што аер ачышчае ваду. Пасля цяжкіх пераходаў, сустрэўшы на сваім шляху рэчку, возера, вадаём, яны кідалі туды кавалкі жывых карэньчыкаў расліны. І пасля гэтага паілі коней, праганялі смагу. Карэньчыкі аеру прыжываліся, берагі вадаёмаў зарасталі духмянай раслінай.

Высушаныя карані аеру можна выкарыстоўваць у якасці прыправы замест лаўровага ліста, карыцы, мускатнага арэха. З каранёў можна зварыць варэнне ці проста зацукраваць. Маладыя сакавітыя і мяккія часткі расліны можна есці сырымі. Гэта смачна і карысна: захоўвае зубы ад разбурэння.

Авіцэна раіў ужываць лекавы настой з аеру пры захворваннях страўніка, печані, у якасці мачагоннага сродку. Парашком, атрыманым з расліны, прысыпалі гнайнікі і раны.

САЛАТА З АЕРУ

Выбраць унутраныя маладыя лісты, нарэзаць палоскамі, дадаць смятану, зялёную цыбулю, соль па смаку.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2481. Нумар падпісаны ў 19.30 25 мая 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7